Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
3 МАЯ 2018 г. ЧАЦВЕР № 83 (28699)
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА



**Тры нішы для «Драздоў»**



**Як настаўніку застацца ў трэндзе**



**Што «Піранні» па зубцах?**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Аляксандр БУРЫ, генеральны дырэктар нацыянальнага парку «Белавежская пушча»:**

*«У 2017 годзе нацыянальны парк наведалі 465 тысяч турыстаў, у тым ліку каля 70 тысяч іншаземцаў. Турыстычны паток павялічваецца. Прагназую, што ў гэтым годзе ён будзе больш, чым летась, таму што за першы квартал па колькасці турыстаў мы прыраслі на 15 %. Яшчэ ўвесь год наперадзе. Мяркую, мы перасягнём лічбу ў 500 тысяч. Прыкметна вырасла актыўнасць беларускіх турыстаў. Таксама выкарыстоўваюць магчымасць наведаць Белавежскую пушчу без візы ўсё больш замежнікаў».*

ISSN 1990 - 763X

# КРЫЛАТЫЯ АБЯРЭГІ ПАМЯЦІ



Жыхар Хойнікаў **Аляксандр ФІЛОНЧЫК** кожную вясну клапоціцца пра знешні выгляд свайго дома, фарбуе аконныя ліштвы. А ліштвы — незвычайныя і невыпадковыя — з птушкамі!

— У нашай вёсцы Дворышча, а гэта недалёка ад райцэнтра, была традыцыя рабіць дэкор над вокнамі ў выглядзе галубоў. «Галубы» былі і на нашай хаце. Зрабіў іх мой бацька — цясляр і сталяр, — успамінае Аляксандр Філончык. — Але пасля чарнобыльскай катастрофы ў 1991 годзе наша сям'я пераехала ў больш бяспечнае месца і купіла гэты дом. І, каб захаваць традыцыю, вырашылі на новым старым будынку таксама «пасяліць» крылатых ахоўнікаў.

Выпільваць і апрацоўваць драўляныя фігуркі бацька даверыў сыну. Дванаццаць птушак — па дзве на кожным акне — Аляксандр зрабіў за тры дні. І вось ужо дваццаць тры гады дом красуе сваімі вокнамі.

— Усе імкнуцца замяніць аконныя рамы на сучасныя еўрапакеты, а я не парушаю гармонію, не мяняю рамы на пластыкавыя. Захоўваю традыцыю і памяць пра дом свайго маленства, вёску і бацьку, — кажа Аляксандр Валянцінавіч.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара,**

*г. Хойнікі.*

■ Разумныя грошы

## А МОЖНА І БЯСПЛАТНА

### За што прыйдзецца раскашэліцца трымальніку карткі

**Мы ўжо шмат казалі пра перавагі банкаўскіх картак. І зручныя яны, і бяспечныя, і нават умеюць прыносіць дадатковы прыбытак. Але, як вядома, у любога медаля ёсць адваротны бок. У нашым выпадку такім бокам можна назваць платнасць, як саміх картак, так і паслуг, якія банкі аказваюць кліентам-трымальнікам.**

### Калі платная карта таннейшая

На самай справе, разнастайных камісій існуе вельмі шмат. Аднак гэта не азначае, што яны штодня будуць праследаваць па пятах трымальніка звычайнага «пластыку». Мабыць, першыя выдаткі, з якімі можа сутыкнуцца патэнцыйны гаспадар карткі, — гэта плата за яе выпуск і абслугоўванне.

Трэба разумець, што ў шэрагу выпадкаў картка можа дастацца вам, што называецца, бязвыплатна, гэта значыць дарма. Так, напрыклад, традыцыйна бясплатна выдаюцца базавыя зарплатныя карткі. Некаторыя банкі ў рамках акцый або проста па дабрыні душэўнай прапануюць афарміць бясплатна ашчадныя карткі, звычайныя дэбетовыя ці нават крэдытныя.

Але ёсць карткі, якія каштуюць вялікіх грошай. Пры афармленні такога «пластыку» трэба разумець, за што вы плаціце, аналізаваць пакет дадатковых паслуг, якія можа быць уключаны ў кошт карткі.

СТАР. 4

■ Напярэдадні падзеі




## Шукаць варыянты, пазітыў і перамагаць

### 82-і чэмпіянат свету па хакеі стартуе заўтра ў Даніі

**Гэтая краіна ўпершыню становіцца гаспадыняй сусветнага першынства ў згаданым відзе спорту. Дарэчы, рашэнне аддаць чэмпіянат датчанам было прынята на кангрэсе Міжнароднай федэрацыі хакея ў 2014 годзе ў Мінску, тады за гэта права змагалася яшчэ і Латвія.**

СТАР. 3



# ЦЭНЫ ПАВІННЫ «ІСЦІ» ЗА ЗАРПЛАТАЙ

**Занятасць насельніцтва, заработная плата, цэнаўтварэнне — пытанні эканамічныя, але ў той жа час не ў меншай ступені — сацыяльныя. Менавіта яны павінны быць у цэнтры ўвагі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі. Такую думку выказаў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падчас сустрэчы з яе старшынёй Міхаілам Ордам.**

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што для яго важна, каб зарплата была зароблена, а не выдадзена дарма. «А для гэтага трэба, каб вытворчасць функцыянавала як належыць», — дадаў ён. Беларускі лідар адзначыў, што ёсць узаемасувязь паміж непрацаўладкаванасцю людзей і ростам злачыннасці. Таму варта даць магчымасць забяспечыць сябе кожнаму, а значыць, неабходна паспрыяць стварэнню новых працоўных месцаў. «Чалавек, які працуе, рэдка становіцца злачынцам», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Што датычыцца цэн, то, па словах Прэзідэнта, падставы для іх росту няма. А калі яны павышаюцца, то гэта робіцца для асабістай нажывы тых, хто павышае. «Там, дзе ёсць вузкія месцы ў цэнаўтварэнні, мы іх бачым, мы іх ведаем, і калі дзяржаўныя органы і ўрад гэта не заўважаюць, прафсаюзы павінны ім дапамагчы», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Цэны павінны напрамую залежаць ад даходаў насельніцтва: калі будзе высокая зарплата, тады і цэны могуць падымацца. А зараз яны растуць за кошт чаго? Напрыклад, на падставе чаго даражэе праезд на грамадскім транспарце, якім карыстаюцца не самыя багатыя людзі? Пошук адказаў на гэтыя пытанні — прамая задача прафсаюзаў.

Таксама кіраўнік дзяржавы пацікавіўся, як адбываецца працэс стварэння прафсаюзных ячэек на прыватных прадпрыемствах, і падняў пытанне аб тым, як пазбавіцца ад празмернасцяў у сістэме прафсаюзаў, як іх варта рэфармаваць. Пажадана, каб не было дублявання паўнамоцтваў і сфер адказнасці ў пэўных галінах, лічыць беларускі лідар.

З мая мінулага года Федэрацыя прафсаюзаў праводзіць маніторынг цэн на сацыяльна значныя тавары і паслугі, які ахоплівае ўсе вобласці і сталіцу. Падчас яго асаблівая ўвага ўдзяляецца суадносінам росту цэн і зарплаты людзей. Так, у сакавіку гэтага года, у параўнанні са снежнем мінулага, кошт набору неабходных прадуктаў харчавання павялічыўся на 1,9 %, а сярэдняя зарплата за гэты час знізілася на 6,9 %. Да таго ж за І квартал 2018 года цэны на жыллёва-камунальныя паслугі выраслі больш чым на 10 %, а праезд у электрычках і дызель-цягніках — на 25 %. Па словах старшыні Федэрацыі прафсаюзаў, людзі скардзяцца і на рост ад 40 да 90 % платы за інтэрнат (асабліва гэта пытанне актуальнае для маладых сем'яў), а таксама на павышэнне кошту больш чым на 300 % перавозкі тэхнікі чыгуначным транспартам для будаўнічых кампаній.

Падчас сустрэчы абмяркоўвалася пытанне і павышэння зарплаты работнікам сацыяльнай сферы. Яго прафсаюзы не раз падымалі ва ўрадзе. Прэзідэнт падкрэсліў, што дадзеныя раней даручэнні павінны быць выкананы, і за іх кіраўнік дзяржавы будзе жорстка патрабаваць. У мінулым годзе на 7 % зарплата для гэтай катэгорыі грамадзян ужо падымалася, але, па словах Міхаіла Орды, такія рашэнні носяць, хутчэй, «касметычны» характар і ў цэлым праблему не здымаюць. «Сёння неабходна цалкам перагледзець мадэль фарміравання заработнай платы», — лічыць старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі. Па яго словах, яна шмат у чым запазычаная яшчэ з савецкіх часоў і на дадзеным этапе занадта ўскладнілася і патрабуе змен.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**

# ПЕРШЫЯ Ў БАРАЦЬБЕ З КАРУПЦЫЯЙ

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка задаволены антыкарупцыйнай дзейнасцю Камітэта дзяржаўнай бяспекі. Кіраўнік дзяржавы сказаў аб гэтым падчас сустрэчы са старшынёй КДБ Валерыем Вакульчыкам.**

«Эфектыўная барацьба з карупцыяй відаць. У Камітэце дзяржаўнай бяспекі гэтаму надаюць вялікае значэнне, — сказаў Прэзідэнт. — Але пры гэтым нельга забываць, што ў Камітэта дзяржбяспекі ёсць спецыфічныя праблемы і пытанні, якія вы курыруеце і якія ажыццяўляць ніхто не можа, акрамя КДБ: разведка, контрразведка, антытэрарыстычная дзейнасць, абарона канстытуцыйнага ладу». Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што і ў гэтых кірунках камітэт актыўна працуе.

У краіне пастаянна адбываюцца масавыя мерапрыемствы, на якіх аднachасова прысутнічае вялікая колькасць людзей. Неўзабаве мы будзем адзначаць такія святы, як Дзень Перамогі, Дзень Незалежнасці. «Тут мы павінны таксама бачыць, ці ёсць у нас праблемы напярэдадні гэтых мерапрыемстваў. І ўвогуле грамадская бяспека: як камітэт яе ацэньвае?» — пацікавіўся Аляксандр Лукашэнка.

Валерый Вакульчык падзякаваў за высокую адзнаку асобных кірункаў работы камітэта, але падкрэсліў, што заспакойвацца не трэба. Па словах старшыні КДБ, зараз актыўная работа ідзе не толькі ў супрацьдзеянні карупцыі, але і па лініі разведкі. «Прымяняем новыя формы і метады работы для атрымання вынікаў. Перш за ўсё гэта датычыцца апераджальнай інфармацыі, прызначанай для Прэзідэнта і іншых кіраўнікоў краіны аб знешніх пагрозах бяспецы Беларусі», — растлумачыў ён.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### 17 ШТАТАЎ ПАДАЛІ Ў СУД НА ТРАМПА

Генеральны пракурор Каліфорніі Ксаўе Бесера заявіў у Сакрамента, што гаворка ідзе не пра тое, каб шукаць канфлікт з адміністрацыяй Трампа. «На карту пастаўлена занадта шмат чаго, што закранае здароўе і эканоміку Амерыкі, каб сядзець склаўшы рукі».

У сваю чаргу губернатар Каліфорніі Джэры Браўн абвінавачыў кіраўніка Агенцтва па ахове навакольнага асяроддзя ЗША (ЕРА) Скота Пруіта ў тым, што той парушае існуючае заканадаўства і ставіць пад пагрозу здароўе людзей. Па словах Браўна, Пруіт і Трамп хочуць, каб людзі куплялі больш бензіну і тым самым яшчэ больш забруджвалі навакольнае асяроддзе.

Белы дом адмовіўся ад каментарыяў, заявіўшы, што спачатку вывучыць скаргу, пададзеную ў суд акругі Калумбія. Акрамя Каліфорніі, іскавую заяву падпісалі Нью-Ёрк, Ілінойс, Аява і іншыя штаты.

У пачатку красавіка ЕРА абвясціла аб рашэнні адмяніць жорсткія правілы, якія датычацца нормаў спажывання паліва аўтамабілямі, прынятыя ў часы праўлення былога прэзідэнта ЗША Барака Абамы. Гэтыя нормы маюць вырашальнае значэнне для зніжэння аб'ёмаў аўтамабільных выхлапаў.

Аднак аўтаканцэрны асцерагаюцца страты больш як 1 млн працоўных месцаў з-за падаражэння аўтамабіляў з прычыны выканання экалагічных прадпісанняў. Супраць планаў Абамы выступіў Саюз аўтавытворцаў, у склад якога ў ліку іншых уваходзяць Volkswagen, General Motors і Toyota.

### СМІ: КІМ ЧЭН ЫН ПАГАДЗІЎСЯ СУСТРЭЦЦА З ТРАМПАМ

Лідар КНДР Кім Чэн Ын пагадзіўся сустрэцца з прэзідэнтам ЗША Дональдам Трампам у дэмілітарызаванай зоне ў вёсцы Пханмунджом на мяжы Паўночнай і Паўднёвай Карэі, паведамляе CNN.

Сустрэцца з Трампам у Пханмунджоме кіраўніка КНДР перакanаў прэзідэнт Паўднёвай Карэі Мун Чжэ Ін. Суразмоўнік тэлеканала растлумачыў, што Кім Чэн Ын пагадзіўся з яго прапановай у сувязі з тым, што ў гэтай вёсцы ўжо гатова ўсё неабходнае абсталяванне для правядзення сустрэчы. На мінулым тыдні ў Пханмунджоме адбыліся перагаворы Кім Чэн Ына і прэзідэнта Паўднёвай Карэі Мун Чжэ Іна. У прыватнасці, яны дамовіліся аб сумеснай працы па поўнай дэнуклеарызацыі Карэйскага паўвострава.

Суразмоўнік CNN адзначыў, што сустрэча Трампа і Кім Чэн Ына пройдзе ў канцы мая.

### ПАШЫНЯН ПАСЛЯ ПАРАЖЭННЯ НА ВЫБАРАХ ЗАКЛІКАЎ ПЕРАКРЫЦЬ ДАРОГІ І АЭРАПОРТ



Лідар пратэстаў у Арменіі Нікол Пашынян пасля свайго паражэння на выбарах прэм'ера ў парламенце краіны выступіў на мітынгу ў цэнтры Ерэвана і заклікаў грамадзян да татальнай забастоўкі.

Пашынян заклікаў блакаваць усе міждзяржаўныя і рэспубліканскія дарогі, чыгунку, а таксама аэрапорт Ерэвана. «Мы пачынаем татальныя дзеянні грамадзянскага непадпарадкавання. Наша патрабаванне — прызнаць перамогу народа і абраць прэм'ерам кандыдата народа», — заявіў Пашынян на мітынгу на плошчы Рэспублікі.

Раней парламент Арменіі на спецыяльным пасяджэнні з нагоды выбараў часовага прэм'ер-міністра не падтрымаў кандыдатуру Нікола Пашыняна. За яго прагаласавалі 45 дэпутатаў, супраць — 56.

Згодна з канстытуцыяй Арменіі, пры няўдалай спробе выбраць прэм'ера праз сем дзён у парламенце праводзіцца яшчэ адно галасаванне. Калі прэм'ера не ўдасца абраць і другі раз, парламент будзе распушчаны, а часовым кіраўніком кабінета міністраў застанецца Карэн Карапецян.

## ■ Пасланне Прэзідэнта-2018



**Валянціна КУРСЕВІЧ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы:**

— «Мы будзем дзяржаву для народа», — заявіў Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка. Адсюль і адзін з асноўных пасылаў выступлення — моцная сацыяльная палітыка і нацыянальная бяспека.

Прэзідэнт Беларусі заклікае не спыняцца на дасягнутых выніках, а паступова рухацца далей. У Пасланні агучана неабходнасць штогод павялічваць расходы на сацыяльныя патрэбы, што будзе садзейнічаць павышэнню якасці жыцця людзей. Кіраўнік дзяржавы таксама ўдзяліў увагу пытанням працоўнай занятасці насельніцтва, неабходнасці стварэння новых высокапрадукцыйных рабочых месцаў, росту даходаў. У вырашэнні пастаўленых задач вельмі важнае адзінства ўсяго беларускага народа. Менавіта на кожным з нас ляжыць адказнасць за мір і парадак у нашай краіне. Толькі разам мы зможам пераадолець усе выклікі, справіцца з усім ■

## ■ Сацыяльны вектар

# І ДЖАКУЗІ Ў... ДОМЕ-ІНТЭРНАЦЕ

**Што зроблена і што плануецца зрабіць для пенсіянераў, людзей з абмежаванымі магчымасцямі? Гэтыя пытанні абмяркоўваліся ў Віцебскім аблвыканкаме. На пасяджэнні прысутнічаў старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА.**

На Віцебшчыне 25,5 % грамадзян пажылога ўзросту — каля 300 тысяч чалавек. З абмежаванымі магчымасцямі — 58,7 тысячы, або 5 % ад агульнай колькасці насельніцтва.

Як адзначыў **старшыня камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Віцебскага аблвыканкама Аляксандр ХРЫСТАФОРАЎ**, сацыяльныя паслугі дома непрацаздольным аказваюць 25 тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, дзе функцыянуе 181 аддзяленне. Па іх колькасці, дарэчы, Віцебская вобласць займае першае месца ў краіне. 21 аддзяленне кругласутачнага знаходжання прымае грамадзян пажылога ўзросту, інвалідаў.

**Старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай ШАРСНЁЎ** пацікавіўся, ці ёсць чарга сярод тых, хто хацеў бы ў дамы-інтэрнаты. Аказваецца, такой праблемы няма. Штогод ствараюцца дадатковыя месцы. У прыватнасці, летась — 25, у 2016 годзе — 33. Неабходнасць у апошніх кантралюецца. У вобласці функцыянуе 15 стацыянарных устаноў сацыяльнага абслугоўвання, дзе жывуць звыш 3,5 тысячы чалавек. Цікава, што працягласць жыцця тых, хто пражывае ў дамах-інтэрнатах агульнага тыпу, — 84 гады.

Такім установам нярэдка дапамагаюць спонсары, для паляпшэння ўмоў пражывання выкарыстоўваюцца пазабюджэтныя сродкі. Такім чынам, напрыклад, у Глыбоцкім інтэрнаце купілі джакузі, медыцынскае абсталяванне, інвентар, а ў Аршанскім — энергаэфектыўнае пральнае і сушыльнае абсталяванне...

**Спікер Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА** заклікаў кіраўнікоў мясцовай улады не лічыць пытанні жыццезабеспячэння грамадзян другараднымі. У тым ліку пытанне доступу людзей з абмежаванымі магчымасцямі да аб'ектаў сацыяльнай інфраструктуры. Павінна быць выканана своечасова ўсё, што запланавана.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# Тыдзень бясплатных адвакатаў

**З 3 да 11 мая ў нашай краіне пройдуць бясплатныя кансультацыі адвакатаў для людзей з інваліднасцю.**

Ужо сёння грамадзяне з любой групай інваліднасці, а таксама сем'і, якія выхоўваюць дзяцей з псіхафізічнымі асаблівасцямі, з 9.00 да 18.00 змогуць атрымаць бясплатныя кансультацыі ў адвакацкіх кабінетах, адвакацкіх бюро і юрыдычных кансультацыях Гомельскай абласной і Мінскай абласной калегій.

Аналагічная акцыя сёння з 10.00 да 15.00 адбудзецца і ў Брэсцкай вобласці.

У Мінскай гарадской калегіі адвакатаў бясплатныя кансультацыі пройдуць 4 мая — з 10.00 да 17.00. Каб пракансультавацца, трэба будзе звярнуцца ў Офіс па правах людзей з інваліднасцю, размешчаны па вул. Варанянскага, 50/4.

У Магілёўскай вобласці бясплатныя юрыдычныя кансультацыі для людзей з інваліднасцю пройдуць 7 мая. У Гродзенскай і Віцебскай абласцях — 8 мая.

Усе кансультацыі пройдуць у рамках Тыдня даступнасці, які праводзіць Офіс па правах людзей з інваліднасцю і ў якім традыцыйна прымаюць удзел беларускія адвакаты. Тым больш што галоўны акцэнт Тыдня даступнасці ў гэтым годзе — права на правасуддзе і даступнасць юрыдычнай дапамогі людзям з інваліднасцю.

**Святлана БУСЬКО** ■

■ Ведай нашых!

# Алімпійцы пад знакам «эка»

**Сталічныя школьнікі перамаглі ў міжнароднай экалагічнай алімпіядзе па біялогіі ў Найробі (Кенія) — самым вялікім міжнародным конкурсе навуковых праектаў сярод вучняў сярэдніх школ.**

Падчас сустрэчы з адным з прызёраў алімпіяды, вучнем сярэдняй школы № 130 г. Мінска Цімафеем Фёдаравым, **міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй ХУДЫК** уручыў яму пісьмо з падзякай ад Мінпрыроды і каштоўныя падарункі, а таксама выказаў удзячнасць педагогам Рэспубліканскага цэнтра экалогіі і краязнаўства за падрыхтоўку таленавітых юных вучоных і бацькам хлопцаў.

Дзесяцікласнік Цімафей Фёдараў (сярэдняя школа № 130 г. Мінска) і адзінаццацікласнік Дзмітрый Харытонаў (гімназія № 13 г. Мінска) на алімпіядзе прадставілі праект «Павышэнне эфектыўнасці арганічнага і традыцыйнага земляробства біятэхналагічнымі метадамі», за які былі ўзнагароджаны залатымі медалямі і спецыяльнымі сертыфікатамі.

Юныя вучоныя займаліся пошукам бактэрый і стварэннем біяпрэпаратаў — жывых стымулятараў росту раслін, здольных утылізаваць сінтэтычныя хімічныя рэчывы, што трапляюць у глебу ў выніку выкарыстання пестыцыдаў.

**Вераніка КОЛАСАВА**

# Ваеннай гісторыяй з'яднаныя

**У сталіцы падвялі вынікі IV Міжнароднай алімпіяды курсантаў СНД па ваеннай гісторыі, прысвечанай 100-годдзю стварэння Чырвонай арміі. У гістарычнай алімпіядзе спаборнічалі каманды з чатырох краін: Беларусі, Казахстана, Расіі і Узбекістана.**

Нашу краіну прадстаўляла каманда Ваеннай акадэміі.

Пераможцам у абсалютным асабістым першынстве прызнаны **курсант другога курса агульнавайсковага факультэта Ваеннай акадэміі Беларусі Канстанцін КАЗЛОЎСКІ**. Як ён расказаў, сакрэт яго поспеху ў якаснай падрыхтоўцы і волі да перамогі. Любоў да гісторыі ў хлопца з'явілася яшчэ ў школе, а ў Ваеннай акадэміі ён працягнуў развіваць свой інтарэс.

Падчас цырымоніі ўзнагароджвання **начальнік Ваеннай акадэміі Беларусі генерал-маёр Віктар ЛІСОЎСКІ** выказаў меркаванне, што інтэлектуальнае спаборніцтва ў веданні ваеннай гісторыі аб'ядноўвае брацкія народы: «Прыемна, што на алімпіяду прыязджаюць моцныя прадстаўнікі вышэйшых навучальных устаноў, самыя моцныя прадстаўнікі ўзброеных сіл сваіх краін», — падкрэсліў Віктар Лісоўскі.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ**

■

■ Надвор'е

# Прыпякае як у ліпені

**Досыць цёплае надвор'е чакаецца ў краіне на гэтым тыдні, перадаюць спецыялісты Рэспубліканскага гідраметэацэнтра.**

Заўтра месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы з навальніцамі. Уначы і раніцай чакаецца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 10 да плюс 16 градусаў. Удзень паветра прагрэецца да плюс 23—29 градусаў, па паўночным захадзе краіны будзе 20—22 цяпла.

Уначы і раніцай у суботу ў асобных раёнах, а ўдзень пераважна па паўднёвым усходзе краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Уначы і раніцай чакаецца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе ў асноўным ад плюс 7 да плюс 13 градусаў, удзень — 16—22 цяпла. Толькі па паўднёвым усходзе краіны ўначы будзе плюс 14—15 градусаў, удзень паветра прагрэецца да 23—27 цяпла. У нядзелю ў зоне павышанага атмасфернага ціску будзе пераважна без ападкаў. Толькі па паўднёвым усходзе краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, месцамі прагрымяць навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 5—12 градусаў. Спадзе спякота і ўдзень, чакаецца ад плюс 16 да плюс 22 градусаў, а па паўднёвым усходзе краіны паветра прагрэецца да 24 цяпла.

* * *

Першы дзень мая быў багаты на тэмпературныя рэкорды. Сярэднясутачная тэмпература паветра ў гэты дзень склала плюс 17—21 градус, што больш чым на 10 градусаў перавышае кліматычную норму. А ў Мінску 1 мая быў пабіты тэмпературны рэкорд 41-гадовай даўніны. Сёлета ў беларускай сталіцы паветра прагрэлася да 27,4 градуса. Раней самая высокая тэмпература ў першы дзень мая была ў 1977 годзе — 26,7 градуса.

**Сяргей КУРКАЧ**

■

■ На слыху

# БЯДА НА ДВУХ КОЛАХ

## Супрацоўнік ДАІ загінуў, спрабуючы спыніць бяспраўніка

**ДТЗ адбылося ўвечары 30 красавіка ў Гомелі. Нарад ДПС, які складаўся з двух інспектараў, нёс службу па забеспячэнні грамадскага парадку і бяспекі дарожнага руху на службовых матацыклах.**

Як паведаміў **афіцыйны прадстаўнік УУС Гомельскага аблвыканкама Віталь ПРЫСТРОМАЎ**, супрацоўнікі ДПС заўважылі матацыкл «Хонда CBR» без рэгістрацыйных знакаў. Законныя патрабаванні аб спыненні яго кіроўца праігнараваў і толькі паскорыў рух. Тады, уключыўшы праблісковыя маячкі чырвона-сіняга колеру і сірэну, праваахоўнікі пачалі яго пераследаваць. Рухаючыся па крайняй левай паласе, адзін з супрацоўнікаў сутыкнуўся з машынай «Нісан Кашкай», якая разварочвалася з сустрэчнай крайняй левай паласы. За рулём аўтамабіля знаходзіўся гамяльчанін 1957 года нараджэння, ні ён, ні пасажыр не пацярпелі. Матацыкл жа ў выніку сутыкнення загарэўся. Інспектар ДПС, 1988 года нараджэння, з цяжкімі траўмамі быў дастаўлены ў рэанімацыйнае аддзяленне Гомельскай абласной клінічнай бальніцы, выратаваць яго не ўдалося.

Той жа ноччу супрацоўнікі міліцыі пры падтрымцы мотаруху Гомельскай вобласці ўстанавілі асобу кіроўцы матацыкла «Хонда CBR». Ім аказаўся 20-гадовы жыхар Рэчыцы, які не мае адпаведнай вадзіцельскай катэгорыі на кіраванне матацыклам. Да таго ж ён неадназразова прыцягваўся да адміністрацыйнай адказнасці за парушэнне правілаў дарожнага руху.

Упраўленнем Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь па Гомельскай вобласці па факце ДТЗ распачата крымінальная справа па частцы 2 артыкула 317 КК Рэспублікі Беларусь.

Сваякам загінулага супрацоўніка міліцыі кіраўніцтва і асабісты склад органаў унутраных спраў Гомельскай вобласці аказваюць неабходную падтрымку.



Як расказаў Віталь Прыстромаў, усяго ў Гомельскай вобласці зарэгістравана больш за 68 тысяч адзінак мотатранспарту, да якога адносяцца матацыклы і мапеды, з іх — больш за дзевяць тысяч у самім Гомелі. У мінулым годзе на тэрыторыі вобласці адбылося 20 ДТЗ з удзелам матацыклістаў, два чалавекі загінулі, 20 атрымалі траўмы. Пяць ДТЗ адбылося па віне нецвярозых матацыклістаў.

Што да працы супрацоўнікаў ДАІ, то ў падпарадкаванні ДАІ УУС Гомельскага аблвыканкама знаходзіцца сем матацыклаў, якія выкарыстоўваюцца для патрулявання Гомеля ў вясінова-летні перыяд. Гэта ўжо сталая практыка. У мінулым годзе аўтапарк абласнога ДАІ папоўніўся на пяць новых адзінак: тры матацыклы BMW і два матацыклы Yamaha.

**Дар'я КАСКО**

■

# СМЯРОТНЫЯ АБДЫМКІ ВАДЫ...

**Апошнія дні былі азмрочаны ў краіне здарэннямі, звязанымі з трагічнай гібеллю людзей на вадзе.**

27 красавіка жыхар Жабінкі ўпаў з веласіпеда і патануў у аднайменнай рацэ, якая працякае праз раённы цэнтр. Ранкам цела 62-гадовага мясцовага жыхара было знойдзена ў вадзе. Мяркуецца, што чалавек быў нападпітку.

28 красавіка двухгадовы хлопчык патануў у двары прыватнага дома ў аграгарадку Усялюб Навагрудскага раёна. Хлопчыкі 2015 і 2016 гадоў нараджэння разам са старэйшай сястрой гулялі. Бацька быў на працы, маці карміла жывёлу ў хляве, перыядычна назіраючы за дзецьмі. У нейкі момант малодшы сын знік з вачэй. Яна падбегла да ёмістасці з вадой у двары і ўбачыла хлопчыка там без прыкмет жыцця. Памер ёмістасці, дзе патануў хлопчык, — 1,3 метра на два метры, узровень вады ў ёй складаў каля 25 сантыметраў.

Удзень 29 красавіка ў Сенненскім раёне ў вадаёме каля дома патанула аднагадовая дзяўчынка. Дзіця разам з маці было ў двары. Жанчына мыла бялізну і брала ваду ў вадаёме за 35 метраў ад жылля. Калі маці панесла яе дадому, дзяўчынка засталася гуляць. Вярнуўшыся, жанчына ўбачыла цела ў вадзе... Выкліканыя медыкі зафіксавалі смерць дзіцяці... У гэты ж дзень 51-гадовы рыбак на Нёмане заблытаўся ва ўласных сетках і загінуў.

Ужо ўдзень 1 мая ў вёсцы Ясянец Мазырскага раёна ў вадаёме на прысядзібным участку патануў шасцігадовы хлопчык. Жыхарка Мазыра прыехала ў вёску разам са сваім дзіцем. Там яна разам з роднымі займалася агародам, а хлопчык падносіў ваду з копанкі. У нейкі момант дзіця звалілася у вадаём і выратаваць яго не ўдалося...

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# Шукаць варыянты, пазітыў і перамагаць

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Матчы чэмпіянату свету пройдуць у двух гарадах — Капенгагене і Хернінгу, турнір будзе згуляны па ўжо звыклай схеме: 16 зборных разбіты на дзве групы і на першым этапе згуляюць па кругавой сістэме. Каманды, якія занялі першыя чатыры месцы, выходзяць у плэй-оф, а каманды, якія занялі восьмыя месцы, вылятаюць у першы дывізіён чэмпіянату свету 2019 года. Сёлета ў турніры бяруць удзел дружыны з трох кантынентаў — 13 з Еўропы, дзве з Паўночнай Амерыкі і адна з Азіі.

**Зборная Беларусі згуляе ў групе А разам з камандамі Расіі, Швецыі, Чэхіі, Швейцарыі, Славакіі, Францыі і Аўстрыі**. Матчы гэтай групы пройдуць у Капенгагене на галоўным стадыёне турніру — «Роял-Арэне». Ён змяшчае 12,5 тысячы гледачоў, быў адкрыты зусім нядаўна — у пачатку 2017 года, аднак ужо паспеў прыняць буйны спартыўны турнір — чэмпіянат Еўропы па плаванні на кароткай вадзе.

Цікавасць да хакея ў Даніі зараз неверагодна высокая — білеты на матчы сваёй каманды ў Хернінгу раскупілі яшчэ восенню. Па традыцыі, спачатку ў продаж паступілі пакеты білетаў на ўсе матчы папярэдняга раўнда адной зборнай, такі пакет каштаваў ад 117 да 450 еўра, а пакет на ўсе гульні плэй-оф — ад 350 да 1800 еўра. Цяпер даступныя білеты толькі на асобныя матчы.

Афіцыйным талісманам сусветнага першынства ў Даніі стала качка, імя якой выбіралі галасаваннем сярод балельшчыкаў. Качка Даклі — гэта на самай справе малады лебедзь, чый вобраз навеяны казкай Андэрсана «Брыдкае качаня».

Плэй-оф чэмпіянату свету пачнецца 17 мая. Хернінг і Капенгаген прымуць па два чвэрцьфінальныя матчы, а паўфіналы і фінальныя стадыі ўсе сустрэчы будуць праходзіць у Капенгагене.

Зборная Беларусі адправілася ў Данію ў сераду, яна пачне свае выступленне матчам з чэмпіёнамі свету мінулага года — зборнай Швецыі.

*— Заўсёды складана фарміраваць фінальны ростар. Мы не маглі выкарыстоўваць некаторых вопытных ігракоў: Касціцыны траўміраваны, Стась не можа прыехаць. Выбралі маладых хакеістаў, якія гараць жаданнем гуляць, жывуць гэтым і хочуць выступаць на чэмпіянаце свету,* — адзначыў **галоўны трэнер зборнай Дэйв Льюіс**. *— Вынік у гульні можа быць розны, але я буду дамагацца таго, каб хлопцы выкладваліся цалкам на лёдзе, адстойваючы гонар краіны. Самае галоўнае — нацэльвацца на вароты і дамагацца найлепшага выніку.*

У мінулым **вядомы хакеіст**, а цяпер **адзін са спецыялістаў Федэрацыі хакея Беларусі Аляксей Калюжны** адзначыў, што цяперашні турнір у Даніі стане адным з самых моцных за апошнія гады. *«Прыедуць вельмі шмат хакеістаў з НХЛ, якія з вядомых прычын не ўдзельнічалі ў Алімпійскіх гульнях у Паўднёвай Карэі. Таму сусветны форум будзе мацнейшы ўзроўнем, чым лютаўскія Гульні. Беларусам прыйдзецца вельмі цяжка, але трэба шукаць варыянты, пазітыў і перамагаць».*

*— На чэмпіянаце свету на нас будзе вялікая адказнасць. Мы едзем туды змагацца за радзіму, за сваю краіну. Настройваемся гуляць да канца з кожным сапернікам. Можам змагацца за выхад у чвэрцьфінал. Гэта рэальна,* — пракаментаваў абаронца Дзмітрый Корабаў.

14-ы год запар зборная Беларусі выступае ў наймацнейшым дывізіёне, за гэты час найлепшым вынікам нашых хакеістаў на чэмпіянаце свету было 6-е месца ў 2006 годзе ў Рызе, найгоршым — 14-я месцы ў 2011, 2012, 2013 гадах. Нагадаем, на леташнім чэмпіянаце свету ў Францыі нашы хакеісты былі трынаццатымі.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

***Склад зборнай Беларусі:***

***галкіперы*** — Іван Кульбакоў, Віталь Трус, Міхаіл Карнавухаў;

***абаронцы*** — Сцяпан Фалькоўскі, Уладзімір Дзянісаў, Раман Дзюкаў, Яўген Лісавец, Крысціян Хенкель, Мікіта Усціненка, Павел Варабей, Дзмітрый Корабаў;

***нападаючыя*** — Павел Развадоўскі, Сяргей Дрозд, Арцём Дзямкоў, Джэф Плат, Ягор Шаранговіч, Аляксандр Мацярухін, Максім Сушко, Шарль Лінгле, Аляксандр Паўловіч, Арцём Леўша, Аляксандр Кітараў, Арцём Кіслы, Яўген Кавыршын, Артур Гаўрус.

***Расклад турніру:***

4 мая
Швецыя — Беларусь (21.10)
5 мая
Францыя — Беларусь (17.10)
7 мая
Беларусь — Расія (17.10)
9 мая
Швейцарыя — Беларусь (17.10)
11 мая
Беларусь — Чэхія (21.10)
12 мая
Аўстрыя — Беларусь (17.10)
15 мая
Беларусь — Славакія (17.10)
17 мая — чвэрцьфіналы (Капенгаген, Хернінг)
19 мая — паўфіналы (Капенгаген)
20 мая — матч за бронзу
20 мая — фінал

***Група В***

Канада
Фінляндыя
ЗША
Германія
Нарвегія
Латвія
Данія
Рэспубліка Карэя.

# А МОЖНА І БЯСПЛАТНА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Адпаведна, **правіла нумар адзін**: перад тым, як унесці плату за выпуск і абслугоўванне карткі, высветліце, ці належаць вам «у даважку» нейкія дадатковыя бясплатныя паслугі або бонусы, і праліччыце, наколькі яны могуць пакрыць сабой расходы, звязаныя з выпускам і абслугоўваннем. Напрыклад, калі вы афармляеце кабрэндынгавую картку за 10 рублёў, якая дае вам зніжку 10 % у вашым любімым супермаркеце, відавочна, што першапачатковыя выдаткі адаб'юцца лёгка і даволі хутка. Такім чынам, не заўсёды бясплатная картка таннейшая за платную.

Другі важны аспект — падыходы банка да збірання платы за абслугоўванне карткі. Многія банкі спаганяюць з кліента плату адразу за ўвесь тэрмін дзеяння карткі. У той жа час ёсць банкі, якія прапануюць паслугу рэгулярнага ўнясення плацяжу — напрыклад, штогадовага або штомесячнага.

Пры гэтым звяжайце, што кошт карткі пры адначасовай аплаце і пры аплаце «ў растэрміноўку» можа адрознівацца. Падумайце, ці гатовыя вы пераплачваць за магчымасць уносіць плату за картку часткамі, а не адразу.

## Не хадзіце ў касу

Вельмі распаўсюджаная камісія — за выдачу наяўных. Звычайна плата за зняцце гатоўкі ў сетцы банка-эмітэнта не спаганяецца. Пры гэтым трэба не забыцца ўдакладніць у вашага банка, ці ёсць у яго партнёрскія праграмы з іншымі банкамі, у рамках якіх можна здымаць наяўныя бясплатна і ў банкаматах «чужых» банкаў.

Вядома, і тут магчымы варыянты. Так, напрыклад, большасць банкаў спаганяе камісію пры зняцці наяўных з крэдытнай карткі нават у «родным» банкамаце. У рамках зарплатных праектаў часам сустракаюцца варыянты, калі зняцце наяўных без камісій у «чужых» банкаматах немагчыма ў прынцыпе — гэта азначае, што арганізацыя, у якой вы працуеце, выбрала самы танны тарыфны план і, верагодна, плаціць банку мінімальную камісію за залічэнне сродкаў на картку. У той жа час ёсць праграмы, у рамках якіх зняцце наяўных без камісій магчыма ў любым банкамаце і нават за мяжой.

У нашай краіне, калі вы здымаеце грошы ў «чужым» банкамаце, банк-эквайер (гэта значыць банк, якому належыць банкамат) камісію не бярэ. Камісію вы плаціце эмітэнту. Аднак за мяжой часта спаганяецца яшчэ і камісія банка-эквайера. Гэта значыць, вы можаце заплаціць падвойную камісію — банку-эмітэнту карткі і банку-эквайеру. Звычайна на экране банкамата з'яўляецца папярэджанне, што з вас будзе спісана нейкая сума. Але не заўсёды і не ўсюды. Таму лепш загадзя высветліць, ці спаганяе замежны банк-эквайер нейкія камісіі.

Акрамя банкаматаў, існуюць пункты выдачы наяўных, прасцей кажучы — аддзяленні банкаў. І часта дзеянне партнёрскіх праграм не распаўсюджваецца на выдачу гатоўкі ў касе.

Калі ў вас так званыя аб'яднаныя сеткі банкаматаў з іншым банкам, гэта не азначае, што вы зможаце бясплатна атрымаць грошы яшчэ і ў пункце выдачы наяўных «дружалюбнага» банка. Справа ў тым, што аперацыйныя выдаткі на ўтрыманне пунктаў выдачы наяўных вышэйшыя, чым на ўтрыманне банкаматаў. Таму ўводзіцца так званая забаронная камісія. Акрамя таго, пры выдачы грошай у касе звычайная падвойная камісія — камісія банку-эмітэнту і банку-эквайеру.

У шэрагу банкаў існуе магчымасць зняцця гатоўкі з рахунку без карткі, па пашпарце. Напрыклад, калі вы забыліся ці згубілі сваю картку. У гэтым выпадку таксама трэба быць гатовым да таго, што банк возьме плату за свае паслугі. Тут магчымыя розныя варыянты — напрыклад, банк можа дазваляць адну такую аперацыю ў месяц бясплатна.

Таму **правіла нумар два** — удакладніце ў банку ўсе нюансы, звязаныя з камісіямі за выдачу наяўных у сваіх і чужых банкаматах, у касах банкаў і за мяжой. Пры замежнай паездцы ўдакладніце, ці спаганяецца ў мясцовых банкаматах і касах камісія з боку банка-эквайера. Зрэдку можна сутыкнуцца з камісіяй не толькі за зняцце, але і за ўнясенне сродкаў на рахунак, так што гэты момант таксама варта загадзя ўдакладніць.

## Насуперак стандартам

Пры аплаце карткай тавараў або паслуг у краме, рэстаране, цырульні і іншых прадпрыемствах гандлю і сэрвісу камісія не спаганяецца. Гэта агульнапрынятыя стандарт.

**Калі вы вырашылі аплаціць нейкія паслугі карткай у касе «чужога банка», набыць які-небудзь тавар у інтэрнэт-краме ці разлічыцца «пластыкам» за мяжой — загадзя пераканайцеся, што вам не прыйдзецца плаціць камісію.**

Аднак трэба ведаць, што часам з камісіяй пры аплаце тавараў і паслуг карткай можна сутыкнуцца ў інтэрнэт-крамах. У нас у краіне — гэта вельмі рэдкі выпадак, аднак у свой час такія сітуацыі мелі месца і лепш загадзя пераканацца, што інтэрнэт-крама не бярэ камісій пры аплаце тавараў плацежнай карткай.

За мяжой такое сустракаецца не толькі ў інтэрнэце, але і ў рэальным жыцці. Акрамя таго, існуе другая частка безнаяўных плацяжоў — камунальныя паслугі, якія аплачваюцца праз касы банкаў, інфакіёскі, інтэрнэт-банкінг і іншыя каналы. Звычайна за аперацыі, якія праводзяцца праз АРІП, не спаганяецца ніякіх камісій, аднак і тут магчымыя варыянты.

Такім чынам, **правіла нумар тры**: не турбуйцеся аб камісіях пры аплаце тавараў у супермаркеце за вуглом або камунальных плацяжоў праз інтэрнэт-банкінг. Аднак, калі вы вырашылі аплаціць нейкія паслугі карткай у касе «чужога банка», набыць які-небудзь тавар у інтэрнэт-краме ці разлічыцца «пластыкам» за мяжой, загадзя пераканайцеся, што вам не прыйдзецца плаціць камісію.

## Танна і хітра

У многіх трымальнікаў плацежных картак рэгулярна ўзнікае неабходнасць ажыццявіць перавод грашовых сродкаў з карткі на картку. Напрыклад, з зарплатнай карткі «перакінуць» сродкі на ашчадную. У большасці выпадкаў за перавод з карткі на картку ў рамках аднаго кліента і аднаго банка аплата не спаганяецца. Але гэта, усё ж, не агульнапрынятыя стандарт.

Калі ж гаворка ідзе пра перавод сродкаў з карткі аднаго банка на «пластык» іншага, то ў большасці выпадкаў згаданая паслуга будзе платная. Тут усё вельмі зменліва. І інфармацыю аб камісіях за пераводы паміж карткамі неабходна ўдакладняць у банку.

Звярніце ўвагу, што ў выпадку перавода сродкаў з крэдытнай карткі па зразумелых прычынах будзе спаганяцца камісія, параўнальная з камісіяй за зняцце наяўных.

## Расплата за бессэнсоўныя дзеянні

З камісіяй можна сутыкнуцца не толькі пры зняцці гатоўкі ў банкамаце, але і пры праглядзе балансу. Пераважная большасць банкаў устанаўлівае камісію за прагляд балансу ў чужой сетцы. Таксама неабходна ведаць, што ў многіх банках прагляд балансу ў сетцы партнёраў таксама платны, нават нягледзячы на тое, што наяўныя там можна здымаць без камісій.

Некаторыя банкі практыкуюць тарыфную палітыку, пры якой кліенту даецца магчымасць некалькі разоў на дзень паглядзець баланс бясплатна, а пачынаючы, напрыклад, з трэцяга разу — з аплатай камісіі. Прычым шматразовы прагляд балансу можа быць платным нават у вашым родным банкамаце банка-эмітэнта.

На самай справе, увод такіх камісій цалкам апраўданы, лічаць фінансісты, асабліва ў выпадку буйных банкаў з вялікай эмісіяй і чэргамі каля банкаматаў. Многія людзі маюць маніякальную схільнасць да прагляду балансу пасля кожнай аперацыі. Падышлі да банкамата — паглядзелі баланс, знялі наяўныя — паглядзелі баланс, аплацілі мабільны тэлефон — і зноў паглядзелі баланс. Каб выключыць такія паводзіны і мінімізаваць чэргі, банкі ўводзяць забаронную камісію на шматразовы прагляд балансу.

Такім чынам, **правіла нумар чатыры**: удакладніце ў банку інфармацыю пра плату за прагляд балансу ў банкаматах банка-эмітэнта і іншых банкаў, праз інтэрнэт-банкінг і іншыя каналы дыстанцыйнага абслугоўвання. Не варта таксама кожныя пяць хвілін правяраць баланс карткі без важкіх на тое прычын.

## Камісія за SMS, новы ПІН і хуткі «пластык»

Аналагічная сітуацыя і з SMS-абвесткай: у некаторых банках дадзеная паслуга бясплатная, у некаторых — платная. Звычайна гэтая плата невялікая (каля рубля ў месяц) і цалкам апраўданая — SMS-ка з'яўляецца эфектыўным інструментам барацьбы з махлярствам, і, акрамя таго, дазваляе кантраляваць баланс рахунку практычна ў рэжыме рэальнага часу.

Часам можна сутыкнуцца з платай за разблакіроўку карткі, як правіла за разблакіроўку па трохкратна няправільна ўведзеным пін-кодзе. Некаторыя банкі аказваюць такую паслугу бясплатна ў тым выпадку, калі кліент самастойна блакуе картку праз інтэрнэт-банкінг.

Існуе шэраг нестандартных для рынку паслуг, такіх як, напрыклад, змена пін-кода. Банкі пазіцыянуюць гэта як дадатковую паслугу. Калі вас не задавальняе выдадзены пін-код, у некаторых банках яго можна змяніць, але за пэўную плату. Часта банкі бяруць грошы за тэрміновы выраб карткі. Зразумела, што бізнес-працэсы пры тэрміновым вырабе яе ўскладняюцца, і за гэта трэба плаціць.

Наўрад ці ўяўляецца магчымым згадаць усе існуючыя тарыфы па картках, ды і вялікай неабходнасці ў гэтым няма. Галоўнае — перад тым, як аформіць банкаўскую картку, падумайце, якія паслугі будуць запатрабаваныя менавіта вамі, і высветліце, якую плату за іх спаганяе той ці іншы банк. Нягледзячы на наяўнасць велізарнай колькасці разнастайных камісій, пры правільным падыходзе да выбару прадукту большасці з іх можна пазбегнуць.

**Сяргей КУРКАЧ.**


**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА**
**по продаже имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, организуемого ККУП «Витебский областной центр маркетинга»**

**Лот № 1.** Незарегистрированное капитальное строение площадью 230,8 кв. м, назначение – здание одноквартирного жилого дома, наименование – жилой дом, расположенный на земельном участке с кадастровым № 240100000002003518 площадью 0,1500 га, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. 6-я Загородная, 109А. **Нач. цена:** 93 960 руб. **Задаток:** 9 396 руб.

**Лот № 2.** Изолированное помещение, расположенное на 2-м этаже капитального строения с инв. № 200/С-50901 общей площадью 229,8 кв. м, назначение – здание специализированное обрабатывающей промышленности, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Димитрова, 36/23. **Нач. цена:** 39 744 руб. **Задаток:** 3 974,40 руб.

**Лот № 3.** Изолированное помещение, расположенное на 2-м этаже капитального строения с инв. № 200/С-50901 общей площадью 300,5 кв. м, назначение – здание специализированное обрабатывающей промышленности, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Димитрова, 36/23. **Нач. цена:** 58 752 руб. **Задаток:** 5 875,20 руб.

**Лот № 4.** Изолированное помещение, расположенное на 1-м этаже капитального строения с инв. № 200/С-50901 общей площадью 291,3 кв. м, назначение – здание специализированное обрабатывающей промышленности, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Димитрова, 36/23. **Нач. цена:** 50 976 руб. **Задаток:** 5 097,60 руб.

**Лот № 5.** Незавершенное незаконсервированное капитальное строение, наружной площадью 36 кв. м, с земельным участком площадью 0,2302 га кадастровый № 222782007601000055 по адресу: Витебская обл., Лепельский р-н, Лепельский с/с, д. Заньки, ул. Озерная, участок 15Б, целевое назначение земельного участка: для строительства и обслуживания жилого дома. **Нач. цена:** 3 045,60 руб. **Задаток:** 304,56 руб.

**Лот № 6.** Изолированное помещение с инв. № 200/D-86161, наименование – производственное помещение, назначение – производственное помещение, площадью 7739,0 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 83. Обременение: ипотека ОАО «Приорбанк». Имущество обращено в доход государства у ООО «ОСТБЕЛИНВЕСТ» (УНП 190136471). **Нач. цена:** 1 071 360 руб. **Задаток:** 107 136 руб.

**Лот № 7.** Капитальное строение с инв. № 710/С-65839, наименование – гараж 415, назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, площадью 41 кв. м, 2011 г. п., расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Днепровской Флотилии, 13/415 (ПГСК-20), расположенное на земельном участке с кадастровым № 741000000002000416. Составные части и принадлежности: подвал. **Нач. цена:** 5 382,72 руб. **Задаток:** 538,27 руб.

**Лот № 8.** Капитальное строение с инв. № 710/С-10661, наименование – жилой дом 92, назначение – жилой дом, площадью 91 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Жуковского, д. 92, расположенное на земельном участке с кадастровым № 741000000008000989. Составные части и принадлежности: две пристройки, сени, четыре сарая, баня, два гаража, уборная. **Нач. цена:** 15 543,36 руб. **Задаток:** 1 554,34 руб.

**Условия:** 1. Участник аукциона, ставший победителем, единственный участник, который приобрел недвижимое имущество по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов (далее – Победитель аукциона), обязан: оплатить полную стоимость приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона. Указанный срок перечисления денежных средств победителем аукциона может быть на основании его письменного ходатайства однократно продлен соответствующим Управлением Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь, созданного в нем межрайонного отдела, в котором имущество состоит на учете, но не более чем на 20 рабочих дней; возместить Организатору аукциона сумму затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона. 2. Переход права собственности на приобретенный на аукционе Объект (Объекты) недвижимости осуществляется в соответствии с законодательством Республики Беларусь. 3. На Победителя аукциона распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

**Организатор аукциона:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел. (0212) 47-20-56.

Аукцион проводится в соответствии с Положением «О порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства», утвержденного Указом Президента Республики Беларусь от 19.02.2016 № 63. Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона **www.marketvit.by**. Для участия в аукционе необходимо подать заявление и подписать соглашение о правах и обязанностях сторон при организации и проведении аукциона с ККУП «Витебский областной центр маркетинга». При оформлении лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет: копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации; документ, подтверждающий полномочия представителя юридического лица и его паспорт; паспорт для физических лиц или их представителей, нотариально заверенная доверенность для представителя физического лица; копию платежного документа, подтверждающего внесение в установленном порядке задатка в размере 10 % от начальной цены продажи; организациями – нерезидентами Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе; документ о состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным в установленном порядке переводом на русский или белорусский язык; представителями организаций – нерезидентов Республики Беларусь – легализованную в установленном порядке доверенность.

**Задаток перечисляется** на р/с BY93MTBK30120001093300066782 в ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, получатель платежа: ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Ранее опубликованные извещения: газета «Звязда» 04.04.2017, 15.07.2017, 28.11.2017, 02.12.2017, 06.01.2018, 18.01.2018, 21.02.2018, 17.03.2018, 20.03.2018.

**Повторный аукцион состоится 22.05.2018 в 11.00** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатков и приема документов:** в рабочие дни с 03.05.2018 с 8.30 по 21.05.2018 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» (каб. № 7). **Конт. тел.: (0212) 47-20-56, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by**



**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА**
**по продаже имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, организуемого ККУП «Витебский областной центр маркетинга»**

**Лот № 1.** Капитальное строение с инв. № 201/С-13039 наименование – жилой дом, назначение – здание одноквартирного жилого дома, площадью 43,8 кв. м по адресу: Витебская обл., Городокский р-н, Стодолищенский с/с, д. Улишицы, ул. Северная, д. 8, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 221880420101000045 площадью 0,2500 га. Составные части и принадлежности: сени, восемь сараев, уборная, навес, крыльцо. **Нач. цена:** 2843,10 руб. **Задаток:** 284,31 руб.

**Условия:** 1. Участник аукциона, ставший победителем, единственный участник, который приобрел недвижимое имущество по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов (далее – Победитель аукциона), обязан: оплатить полную стоимость приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона. Указанный срок перечисления денежных средств победителем аукциона может быть на основании его письменного ходатайства однократно продлен Управлением по Витебской области Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь но не более чем на 20 рабочих дней; возместить Организатору аукциона сумму затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона. 2. Переход права собственности на приобретенный на аукционе Объект (Объекты) недвижимости осуществляется в соответствии с законодательством Республики Беларусь. 3. На Победителя аукциона распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

**Организатор аукциона:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел. (0212) 47-20-56.

Аукцион проводится в соответствии с Положением «О порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства», утвержденного Указом Президента Республики Беларусь от 19.02.2016 № 63. Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона **www.marketvit.by**. Для участия в аукционе необходимо подать заявление и подписать соглашение о правах и обязанностях сторон при организации и проведении аукциона с ККУП «Витебский областной центр маркетинга». При оформлении лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет: копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации; документ, подтверждающий полномочия представителя юридического лица и его паспорт; паспорт для физических лиц или их представителей, нотариально заверенная доверенность для представителя физического лица; копию платежного документа, подтверждающего внесение в установленном порядке задатка в размере 10 % от начальной цены продажи; организациями – нерезидентами Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе; документ о состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным в установленном порядке переводом на русский или белорусский язык; представителями организаций – нерезидентов Республики Беларусь – легализованную в установленном порядке доверенность.

**Задаток перечисляется** на р/с BY93MTBK30120001093300066782 в ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, получатель платежа: ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Ранее опубликованные извещения: газета «Звязда» 09.01.2018, 20.03.2018.

**Повторный аукцион состоится 22.05.2018 в 11.30** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатков и приема документов:** в рабочие дни с 03.05.2018 с 8.30 по 21.05.2018 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» (каб. № 7). **Конт. тел.: (0212) 47-20-56, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by**

# ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

3 МАЯ 2018 г.
ЧАЦВЕР
№ 9 (15840)

Выдаецца
з 21 красавіка 1921 года


*Імёны*



## Віталь КАРПАНАЎ: «У «ДРАЗДОЎ» ДРАЙВ 20-ГАДОВЫХ»

**Іх песні ведае амаль кожны беларус. Яны гучаць па радыё, тэлебачанні, нават у рэкламе, што круцяць у рэйсавым аўтобусе. За свае больш чым дзесяць гадоў існавання гурт «Дразды» пасталеў, але не змяніўся: яго ўдзельнікі па-ранейшаму любяць эксперыменты і не баяцца касых поглядаў. Пра тое, ці цяжка заўсёды быць на пазітыве і чаму «Дразды» ніколі не паедуць на «Еўрабачанне», «Чырвонцы. Чырвонай змене» расказаў фронтмен гурта, артыст, радыё- і тэлевядучы Віталь КАРПАНАЎ.**

***— Ці адрозніваюцца «Дразды» ў плане творчасці, настрою ад сябе саміх, скажам, пяць гадоў таму?***

— Пытанне якраз аб тым, што я зараз вельмі востра перажываю. Мы заўсёды былі, ды і застаёмся, вясёлым гуртам. Але добра быць вясёлым і непасрэдным у 20 гадоў. А калі табе ўжо 36?

На самай справе, гурт змяняецца пастаянна. Мы сталеем і на многія рэчы ў жыцці глядзім інакш. Асабліва гэта датычыцца мяне як аўтара тэкстаў песень. Спадзяюся, мы становімся больш цікавымі, інтэлектуальнымі, захоўваючы пры гэтым сваю весялосць і драйв 20-гадовых. Пры гэтым зараз «Дразды» закрываюць сваёй творчасцю адразу тры нішы: вясёлую непасрэднасць, сур'ёзную лірыку і, што немалаважна ў Год малой радзімы, — мы патрыятычны ансамбль.

*(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)*

*Ідэі маладых*

## Што «Піранні» па зубцах,
### або Вынаходствы са спісанай тэхнікі

**«Казуля», «вамбат», «грызлі», «вожык», «калібры»... Не, гэта не жыхары заапарка, а экспанаты, сабраныя гуртком вынаходнікаў-рацыяналізатараў Смілавіцкага сельскагаспадарчага прафесійнага ліцэя. Што для іншых спісаная тэхніка, для хлопцаў — каштоўны матэрыял. З металалому яны збіраюць унікальныя прылады, якія могуць палегчыць працу на прысядзібным участку і ў гаражы.**


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Майстар вытворчага навучання Арцём Крывапуст расказвае пра самы паспяховы экспанат — міні-экскаватар «Грызлі».

**Майстар вытворчага навучання Арцём КРЫВАПУСТ** вядзе гурток восьмы год. Сам ён родам з Брэсцкай вобласці. Адвучыўся ў Івацэвіцкім дзяржаўным прафесійным ліцэі сельскагаспадарчай вытворчасці, потым у Пінскім дзяржаўным індустрыяльна-педагагічным каледжы і трапіў у Смілавічы па размеркаванні. Тут і застаўся. Арцём расказвае, што ў гурток штогод просіцца шмат ахвотных, але трапляюць толькі тыя, хто настроены сур'ёзна:

— Цяпер займаецца 12 навучэнцаў. Больш стараюся не браць, каб паспяваць кожнаму ўдзяліць час, сачыць за бяспекай — усё ж такі хлопцы працуюць з «балгаркай», зварачным апаратам. На занятках усе задзейнічаны: не цікава ж прыходзіць проста пасядзець.

Малады чалавек падкрэслівае: яны робяць не проста экспанаты, а рабочыя мадэлі. Кожная з іх — гэта вынік калектыўных высілкаў усяго гуртка. Як толькі прылада гатовая, запісваюць відэа, каб паказаць яе ў дзеянні.

*(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)*

*Мазгавы штурм*




Аляксандр Данілаў і Леанід Ларын: «Калі паставіць перад вучнем цікавую мэту, паверце, ён захоча вучыцца!»

### Як настаўніку не адстаць ад часу
## КАМУНІКАТАР, ПСІХОЛАГ, АКЦЁР?

**Ёсць прамая сувязь паміж узроўнем ведаў і ўзроўнем нуды на ўроку. Школе трэба абавязкова змяняцца! Візуалізацыя, гейміфікацыя і нейратэхналогіі — тыя трэнды ў адукацыі, якія проста нельга ігнараваць. У гэтым упэўненыя будучыя педагогі, якія пакуль яшчэ самі не пакінулі школьныя сцены. Днямі ў Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя Максіма Танка прайшла найцікавейшая фарсайт-дыскусія.**

### ПЕДАГАГІЧНАЯ ФУТУРАЛОГІЯ

— Роўна год таму ў нашым універсітэце былі падвedзеныя вынікі рэспубліканскага конкурсу для навучэнцаў педагагічных класаў «Будучыя педагогі — пра школу будучыні». Яго ўдзельнікі прадстаўлялі розныя яе мадэлі. Многія канкурсанты казалі пра тое, што ключавой фігурай у тэхнічна абсталяванай школе будучага застанецца педагог, які «ачалавечвае» адукацыйны працэс, з'яўляецца для сваіх вучняў прыкладам, у тым ліку і ў стаўленні да прафесіі. Тады ў нас, арганізатараў, узнікла ідэя: распачаць доўгатэрміновую сур'ёзную работу з навучэнцамі педагагічных класаў у галіне педагагічнай футуралогіі, — расказала **прарэктар па навуковай рабоце БДПУ, доктар педагагічных навук, прафесар Ганна ТОРХАВА.** — У працяг тэмы мы прапанавалі старшакласнікам пашукаць адказ на пытанне: «Як жа падрыхтаваць педагога, які зможа эфектыўна працаваць у школе будучыні?»

Апрабаваць новую для нашай краіны фарсайт-тэхналогію было прапанавана камандам школ-лабараторый вучэбна-навукова-інавацыйнага кластара бесперапыннай педагагічнай адукацыі. Трэба заўважыць, што з 14 школ-лабараторый адгукнуліся на прапанову не ўсе, а толькі 9: усё ж такі для таго, каб сфармуляваць і агучыць свае ідэі, патрабуюцца інтэлектуальная смеласць, здольнасць да праектна-інавацыйнага мыслення і гатоўнасць працаваць у камандзе.

Задача спікераў была не з лёгкіх. На працягу пяці хвілін яны павінны былі ёміста і лаканічна прадставіць свае фарсайт-ідэі. У выніку старшакласнікі абгрунтоўвалі магчымыя, верагодныя і пажаданыя падзеі і змены ў галіне тэхналогій прафесійнай падрыхтоўкі педагогаў з розных суб'ектных пазіцый: навучэнца педагагічнага класа, студэнта педагагічнай спецыяльнасці і маладога спецыяліста, які працуе ў сферы адукацыі.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*

Адпачыць і зарабіць

# СТАРТАВАЎ ТРЭЦІ ПРАЦОЎНЫ

**Учора на плошчы Дзяржаўнага сцяга ў Мінску Рэспубліканскі штаб студэнцкіх атрадаў БРСМ урачыста адкрыў трэці працоўны семестр.**

Кіраўнікі профільных міністэрстваў, ветэраны руху, ганаровыя госці звярнуліся да студатрадаўцаў з наказам і ўручылі ім працоўныя пуцёўкі для работы ў будаўнічых, сельскагаспадарчых, педагагічных, сэрвісных, экалагічных, медыцынскіх і вытворчых студэнцкіх атрадах. Ва ўрачыстай цырымоніі ўзялі ўдзел больш за тысячу байцоў студэнцкіх атрадаў з усіх рэгіёнаў Беларусі.

Сёлета трэці працоўны семестр пройдзе пад эгідай 55-годдзя беларускіх студэнцкіх атрадаў, летапіс якіх пачынаецца з ліпеня 1963 года, калі першыя будаўнічыя атрады з 16 ВНУ краіны (2,5 тысячы чалавек) выехалі на работу ва Уральскую вобласць Казахстана.

Складнікам студатрадаўскага свята стала і рэспубліканская маладзёжная працоўная акцыя «Маладосць. Традыцыі. Будучыня» з удзелам больш чым трохсот байцоў студэнцкіх атрадаў, старт якой быў дадзены на аб'ектах гісторыка-культурнага комплексу «Лінія Сталіна». Тут моладзь заклала яблыневы сад «Кветкі Вялікай Перамогі» з 55 саджанцаў яблынь сорту «Слава пераможцу!» Таксама былі добраўпарадкаваныя пешаходныя дарожкі па перыметры комплексу, ачышчаны зялёныя зоны ад леташняга лісця, аднаўлены траншэі, пабелены супрацьтанкавыя загароды...

У Год малой радзімы ў ходзе працоўнай акцыі «Маладосць. Традыцыі. Будучыня» ў кожным рэгіёне для добраўпарадкавання будзе вызначаны аб'ект маладзёжнай увагі.

Запіс у студэнцкія атрады яшчэ з сакавіка поўным ходам ідзе ў штабах працоўных спраў устаноў адукацыі і тэрытарыяльных штабах студэнцкіх атрадаў па ўсёй краіне. Ахвотных папрацаваць гэтым летам набралася ўжо больш за 20 тысяч. Першыя атрады адправяцца на месца дыслакацыі ў канцы мая. Беларускія студэнты будуць працаваць як у краіне, так і за яе межамі — у Расійскай Федэрацыі і Польшчы. Прапрацоўваецца пытанне накіравання беларускіх студэнцкіх атрадаў у Казахстан і Малдову. Аднак масава студэнты і навучэнцы прыступяць да работы ў складзе студэнцкіх атрадаў па ўсёй краіне і за яе межамі пасля заканчэння летняй сесіі.

# КАМУНІКАТАР, ПСІХОЛАГ, АКЦЁР?

## ГЕНЕРАТАР ІДЭЙ І НАВАТАР

*«Мы жывём у сучасным свеце, дзе патрабаванні да педагога вельмі высокія. Педагог — не толькі носьбіт сучасных ведаў, але і стваральнік наватарскіх ідэй і працэсаў, гатовы змяняць і рэфармаваць педагагічныя тэхналогіі,* — у гэтым упэўнена **каманда навучэнцаў слонімскай сярэдняй школы № 8, якую прадстаўляла на форуме дзесяцікласніца Марыя АНІКЯЕНКА.** — *Педагог мультыпрофільнага плана павінен валодаць некалькімі спецыяльнасцямі і спалучаць прафесійную падыхтоўку і камунікатыўную кампетэнтнасць, навыкі прадрымальніцкай і кіраўніцкай дзейнасці. Мадэль універсальнага педагога бачыцца нам наступным чынам: гэта лідар, высокакваліфікаваны спецыяліст, які добра разбіраецца ў псіхалогіі, інтэлігент, умелы камунікатар і адміністратар, менеджар, а яшчэ ён акцёр, сцэнарыст, рэжысер і пісьменнік у адной асобе».*




**Вынікам сумеснай работы стала рэзалюцыя, у якой адлюстраваны самыя актуальныя трэнды і тэндэнцыі ў педагагічнай адукацыі.**

— Наша фантазія можа даставіць нас куды заўгодна, таму тэхналогіі візуалізацыі ў навучанні вельмі актуальныя, — разважае **Аляксандр ЛЕНКАВЕЦ, вучань 10 класа Сноўскай сярэдняй школы.** — Не менш важная ў падрыхтоўцы будучага педагога і псіхалогія: яна дапамагае яму стаць больш устойлівым да розных правакацыйных сітуацый. «Самая галоўная формула поспеху — веданне, як кантактаваць з людзьмі», — сцвярджаў Тэадор Рузвельт. Параўноўваючы вобраз сучаснага педагога і маё ўласнае ўяўленне аб тым, якім ён павінен быць, я лічу, што найбольш запатрабаваныя будуць эўрыстычныя ўменні, даследчыя навыкі і такія якасці, як уменне суперажываць, рэфлексаваць, слухаць і чуць іншага, творчая актыўнасць, адкрытасць, настойлівасць, гнуткасць, мабільнасць, уменне працаваць з інтэрнэт-рэсурсамі... Будучаму педагогу трэба вучыцца ствараць праблемныя сітуацыі, арганізоўваць вучэбна-даследчую дзейнасць, цікавіцца педагагічным досведам іншых. Паспяховасць і канкурэнтаздольнасць спецыяліста залежаць і ад умення ўспрымаць новае і вучыць новаму, весці ўласны блог і віртуальны кабінет, працаваць з праблемнымі дзецьмі і бацькамі вучняў. Такім чынам, найбольш эфектыўнымі тэхналогіямі падрыхтоўкі настаўніка ў будучыні з'яўляюцца інтэрнэт-тэхналогіі, тэхналогіі віртуалізацыі і практыкаарыентаванае асяроддзе. Трэба спрабаваць шукаць, бо ніхто не ведае, які шлях акажацца найбольш выніковым.

**Старшакласнікі Грэскай сярэдняй школы** прапануюць з першага курса для кожнага студэнта педагагічнай спецыяльнасці распрацаваць індывідуальную траекторыю асобаснага развіцця пад кіраўніцтвам цьютара. Асноўнымі трэндамі ў падрыхтоўцы педагогаў будучыні з'яўляюцца, на іх думку, індывідуалізацыя і варыятыўнасць навучання з прымяненнем інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій.

«Мы прыхільнікі педагагічнай інтэрнатуры, — кажа **адзінаццацікласніца Валерыя РАХІНСКАЯ.** — У гэты перыяд у педагога-інтэрна будзе магчымасць апрабаваць на практыцы тэму дыпломнай работы і адкарэктаваць свае тэарэтычныя веды. Малады спецыяліст у абавязковым парадку вядзе свой блог для інтэрактыўнага ўзаемадзеяння ўсіх удзельнікаў адукацыйнага працэсу. Асаблівую ўвагу трэба ўдзяляць развіццю рыторыкі, паколькі мы жывём у лічбавым і кліпавым свеце, таму, на жаль, развучыліся прыгожа размаўляць. Мы ўпэўненыя, што адукацыі патрэбныя людзі, якія не толькі ідуць у нагу з часам, але і апярэджваюць яго».

## УВАХОД У ПРАФЕСІЮ

«Для нас мала, каб кожны вучань педагагічнага класа прафесію настаўнік «любіў і паважаў». Мы хацелі б, каб усе захапіліся педагагічным пошукам. Галоўны педагагічны ўчынак — гэта пераход ад тэорыі да практыкі», — лічыць **каманда з віцебскай гімназіі № 5,** якая менавіта так і назвала сваю ідэю — «Педагагічны ўчынак». І першы крок — гэта ўваход у прафесію яшчэ на стадыі навучання ў профільным класе.

— Навучэнцы педкласа не праводзяць самастойна ўрокі, а выступаюць у ролі кансультантаў ці рэпетытараў для малодшых школьнікаў, — тлумачыць **Дар'я БЯЛЯЕВА, вучаніца 10 класа.** — Такім чынам будучыя педагогі напрацоўваюць практычныя навыкі тлумачэння незразумелых для малодшых тэм, карыстаючыся пры гэтым сваім вучнёўскім вопытам. А складанасці, з якімі яны сутыкнуцца, падштурхнуць іх да пошуку вырашэння педагагічных сітуацый праз вывучэнне асноў педагогікі, методыкі і досведу сваіх педагогаў. У кожнага студэнта педагагічнай ВНУ з першага курса і да заканчэння ўніверсітэта павінен быць свой цьютар (класны кіраўнік) і свой падшэфны клас у канкрэтнай школе.

У традыцыйнай мадэлі педагог атрымліваў у ВНУ пераважна тэарэтычную адукацыю, а мы прапануем гэту сістэму перакуліць: максімум практыкі ў педкласе і бесперапыннай практыкі падчас навучання ў ВНУ за кошт змяншэння тэорыі да неабходнага мінімуму. Астатняе студэнт вывучыць у працэсе бесперапыннай самаадукацыі, калі будзе сутыкацца з канкрэтнымі праблемамі на практыцы.

Па заканчэнні ВНУ **выпускнік павінен будзе здаць такі экзамен, у ходзе якога ён прадэманструе свае педагагічныя кампетэнцыі, а не ўзровень тэарэтычнай падрыхтоўкі.** Напрыклад, падрыхтуе і абароніць перад камісіяй план урока па тэме з экзаменацыйнага білета і вырашыць канкрэтную педагагічную сітуацыю. Толькі так можна будзе ацаніць гатоўнасць выпускніка стаць настаўнікам, а не аб'ём яго памяці, дзякуючы якому ён змог завучыць тэорыю па педагогіцы і методыцы.

Аўтары ідэі «Педагагічны ўчынак» лічаць, што навучанне настаўніка павінна стаць намнога больш практычным і тэхналагічным. Малады педагог, які скончыў ВНУ, павінен эфектыўна прымяняць у сваёй рабоце сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі і ўстройствы, а гэтаму яго трэба навучыць. Ён павінен умець вырашаць канфліктныя сітуацыі, валодаць прыёмамі актыўнага слухання, эфектыўнай камунікацыі, ведаць усе апошнія інавацыі ў адукацыі.

## ЛЯКАРСТВА АД ШКОЛЬНАЙ РУЦІНЫ

— Многія веды, якія мы атрымліваем у школе, аказваюцца бескарыснымі і дрэнна запамінаюцца. Школьнікам нецікава вучыцца. Мы лічым, што трэба выкарыстоўваць у працэсе навучання элементы гульні. Будучыня — за гейміфікацыяй, — падзяліліся бачаннем сітуацыі **спікеры ад сталічнай школы № 126 вучні 10 класа Леанід ЛАРЫН і Аляксандр ДАНІЛАЎ.** — У школе за памылкі заўсёды караюць. Асноўнае ж адрозненне гейміфікацыі ад стандартнага навучання — гэта стаўленне да памылак. Усе ведаюць выраз «вучыцца на сваіх памылках»... Для камп'ютарных гульняў гэта галоўны прынцып. Нічога страшнага ў няўдачах няма. Ты памыляешся, выпраўляеш сваю памылку і рухаешся далей. Пры гейміфікацыі дадатковыя гульнявыя правілы ўкараняюцца ў школьную рэчаіснасць. Кожны семестр вучань пачынае з нуля балаў, а потым пачынае іх паступова набіраць, здзяйсняючы пэўныя хады і дасягаючы патрэбных вынікаў. Ён атрымлівае бонусы ў гульні, а на фінішы яго чакае галоўны прыз...

Вядома, што **гульня здольная захапіць усю ўвагу і не адпускаць доўгі час. Вось бы з такой жа апантанасцю школьнікі хацелі вучыцца...** Да таго ж можна гуляць-вучыцца не аднаму, а ў камандзе, а гэта ўжо зусім не сумна... «Калі паставіць перад вучнем цікавую мэту, паверце, ён захоча вучыцца!» — запэўніваюць юнакі.

Фарсайт-ідэя **навучэнцаў з мінскай сярэдняй школы № 6** была прысвечана выкарыстанню ў адукацыі тэхналогій дадатковай рэчаіснасці.

— Сёння ўжо нікога не здзівіш уменнем паказаць прэзентацыю ці прымяненнем інтэрактыўнай дошкі. Не за гарамі той дзень, калі новы трэнд — укараненне сеткавага сёрфінга ў навучанне — трывала зойме свае пазіцыі, — разважае **адзінаццацікласніца Аляксандра КАЛТОВІЧ.** — Навучэнцы змогуць з лёгкасцю звярнуцца да патрэбнага вучэбнага матэрыялу, дакладна ранжыраваць крыніцы інфармацыі, павысіцца гнуткасць і мабільнасць ведаў. У будучыні будзе запатрабаваны педагог-куратар анлайн-прасторы, які валодае камп'ютарным мадэляваннем і здольны навучыць асновам сеткавай бяспекі.

Пагружэнне ў віртуальную рэчаіснасць стане неад'емнай часткай многіх урокаў. Вызначыць узровень успрымання і падрыхтоўкі вучня можна будзе дзякуючы сканаванню сятчаткі вока. Людзі будуць успрымаць інфармацыю ў дзясяткі разоў хутчэй і эфектыўней дзякуючы 3D-візуалізацыі: школьнікі змогуць аказацца дзе заўгодна — у трапічным лесе ці ў Букінгемскім палацы. З'явіцца і новая спецыяльнасць — вэб-псіхолаг. Але тэхніка ў школе будучыні ўсё ж такі ніколі не заменіць кантакт з настаўнікам, нават самы дасканалы робат так і застанецца ўсяго толькі назапашвальнікам інфармацыі.

**У прынцыпе ўсе ўдзельнікі сышліся ў думцы, што настаўнік — у мінулым, сучаснасці або будучыні — гэта любоў, разуменне і цярпенне. Настаўнік — перш за ўсё чалавек (няхай нават і з іншай галактыкі)! Вынікам сумеснай работы стала рэзалюцыя, у якой адлюстраваны самыя актуальныя трэнды і тэндэнцыі ў педагагічнай адукацыі і вызначаны пяць тэхналогій, якія, на думку ўдзельнікаў, будуць эфектыўныя ў падрыхтоўцы педагога новага пакалення.**

**Матэрыялы падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Свой выбар

# УРОКІ КУРСАНЦКАГА ЖЫЦЦЯ

**Прынята лічыць, што моладзь не можа сябе ў чымсьці абмяжоўваць. Магчыма, недзе яно і так. Але ёсць сярод прадстаўнікоў гэтага пакалення і тыя, хто выбірае арганізаванасць і дысцыпліну, як, напрыклад, курсанты Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь Дзмітрый КАСЯНЮК і Іван БУРШТЫН.**


**Курсанты Ваеннай акадэміі Дзмітрый Касянюк і Іван Бурштын *(злева)*.**

Яны вучацца на пятым курсе факультэта сувязі і аўтаматызаваных сістэм інфармацыйнага забеспячэння ў інтарэсах органаў пагранічнай службы. За плячыма ўжо не адзін год вучобы, і да многага хлопцы прывыклі. Але як ім было, калі з бацькоўскага дома патрапілі ў казармы?

— Першапачаткова — цяжка, як фізічна, так і маральна, — расказвае Дзмітрый. — Цяжка было прывыкнуць да новага распарадку дня, бо ты пастаянна чымсьці заняты і падпарадкоўваешся статуту.

Сам Дзмітрый родам з вёскі Ляхаўцы Маларыцкага раёна. У восьмым класе хлопец перайшоў вучыцца ў раённую гімназію, знаходзіўся ў інтэрнаце, і, магчыма, гэта дапамагло яму хутчэй адаптавацца да жыцця ў казарме.

— Акадэмія нас змяніла, мы сталі больш адказнымі і вынослівымі, навучыліся прымаць рашэнні ў складанай абстаноўцы і ў самыя кароткія тэрміны, — адзначае Дзмітрый.

— Але ўсё ж такі, напэўна, многім прыйшлося ахвяраваць, паступіўшы сюды вучыцца? — цікаўлюся ў курсанта.

— Я не сказаў бы. Так, мы жылі ў казармах і інтэрнатах армейскага тыпу і не маглі па сваім жаданні выйсці прагуляцца ў горад, схадзіць у кавярню або сустрэцца з дзяўчынай, як гэта можа зрабіць любы цывільны студэнт. Але ведалі, што за гэтыя абмежаванні дзяржава нам дае адукацыю, апранае, корміць, і стыпендыю атрымліваем значна вышэйшую, чым у звычайных студэнтаў. Таму думкі аб тым, што мы ў чымсьці абмежаваныя, нас не наведваюць.

Іван Бурштын родам з вёскі Вотчын таго ж Маларыцкага раёна. Ён скончыў Ляхавецкую сярэднюю школу. Хлопцы вучацца па адной спецыяльнасці.

— Нашы веды нам могуць дапамагчы не толькі ў ваеннай службе. Мы вывучалі некаторыя мовы праграмавання, устройства і эксплуатацыю персанальных электронна-вылічальных машын, сервернае і сеткавае абсталяванне, — расказвае Іван. — Прасцей кажучы, зможам працаваць у сферы інфармацыйных тэхналогій.

Але хлопцы пакуль не задумваюцца аб грамадзянскіх спецыяльнасцях. Яны абодва вучацца на бюджэтнай аснове, а значыць, у адрозненне ад цывільных студэнтаў, пасля Ваеннай акадэміі ім давядзецца адслужыць пяць гадоў. Але курсантаў гэта не пужае, бо яны свядома выбіралі свой жыццёвы шлях.

На пытанне: «Што для вас значыць Радзіма?» Дзмітрый і Іван адказалі: «Гэта краіна, дзе мы нарадзіліся і жывём, дзе побач нашы родныя і блізкія, і тое, за што ў любую хвіліну мы гатовыя пастаяць».

**Павел КАНАНОВІЧ.**

Адна каманда

# АРГАНІЗАВАЦЬ КАНЦЭРТ?

## Галоўнае — нестандартны падыход і рызыка!

**Колькі вы ведаеце маладых людзей, якія адкрылі свой бізнес па арганізацыі культурных і музычных мерапрыемстваў? Напэўна, няшмат. Мне ўдалося пазнаёміцца з удзельнікамі аднаго з такіх праектаў — «Лэйбл MZ production». Каманда займаецца выданнем і прэзентацыяй альбомаў, арганізацыяй канцэртаў, падтрымкай арганізацыі мастацкіх выстаў і нават тэатральных пастановак. Яна супрацоўнічае з многімі айчыннымі ўстановамі і выканаўцамі.**



— Ідэя стварэння праекта з'явілася зімой 2012 года, — расказаў **арганізатар і кіраўнік Мікалай ЗАЯЦ.** — За пяць гадоў дзейнасці каманда ўжо паспела пасупрацоўнічаць з арганізатарамі больш як 200 мерапрыемстваў у Беларусі і ў блізкім замежжы (Украіне, Расіі, Польшчы), правесці мноства ўласных мерапрыемстваў, прэзентаваць дыскі і альбомы. Напрыклад, у запісе аднаго з уласных CD — «Жалуды», 2013 года — прынялі ўдзел Макс Корж і група «ЛСП», якія выканалі для дыска рэп-кампазіцыі на беларускай мове.

Сёння ў каманду ўваходзіць дзевяць чалавек. Кожны адказвае за ўласны кірунак: прэса, менеджмент, фатаграфія.

Памочнікам арганізатара мерапрыемстваў з нядаўняга часу з'яўляецца Аксана Крупнова, студэнтка Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

— У каманду я трапіла з-за цікавасці да беларускай культуры і музыкі. Хацелася разабрацца, на якім узроўні ў нас цяпер знаходзіцца музычная індустрыя. Мне захацелася атрымаць добры арганізатарскі вопыт, а ў гэтым праекце можна рэалізаваць свой патэнцыял і папрацаваць з цікавымі людзьмі. Для мяне важная атмасфера, і я яе знайшла, — кажа дзяўчына.

Цяпер каманда займаецца падрыхтоўкай да правядзення штогадовага рэп-фестывалю «Уключай біт». Гэта складанае мерапрыемства, якое патрабуе шмат намаганняў у тэхнічнай падрыхтоўцы. Фэст славіцца цікавай праграмай, наяўнасцю адразу дзвюх лакацый (мода і музыка), а таксама дзеліцца на тры часткі: батл-секцыю, беларускамоўную і рускамоўную секцыі. На мерапрыемстве выступіць больш за 15 выканаўцаў. Па выніках фестывалю плануецца зладзіць дабрачынную акцыю разам з беларускімі музыкантамі.

— Акрамя бягучых праектаў, плануем арганізаваць беларускамоўны джаз-фэст. Думаю, будзе цікава. Тым больш, што ў наш час цэняцца нестандартныя і нефармальныя падыходы, — кажа Мікалай. — Таму пры ўвасабленні ў жыццё ўласных ідэй раю прыдумляць нешта новае, цікавае і не забываць, што любая справа — гэта рызыка. Рызыкуйце!

**Ірына ЛУКАШЫК, студэнтка I курса Інстытута журналістыкі БДУ.**

# Што «Піранні» па зубцах...

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)***

— Калі ў галаву прыходзіць нейкая ідэя, я гляджу ў інтэрнэце, ці ёсць што-небудзь падобнае. Можа, няма сэнсу прыдумляць? Часам спрабую ўдасканаліць тое, што ўжо існуе, — кажа Арцём.

Ён паказвае нам вынаходкі. Вось, напрыклад, апошняя распрацоўка — пад'ёмнік «Геркулес». Спатрэбіцца ў гаражы ці на СТА. Заязджаеш пярэднімі ці заднімі коламі машыны на спецыяльныя падстаўкі, з дапамогай электраперфаратара прыводзіш механізм у дзеянне, і ён адрывае патрэбную частку аўтамабіля ад зямлі. Калі ласка, можна рамантаваць.

Яшчэ адна прыдумка ліцэйскіх «кулібіных» — рэкуператар паветра «Калібры». Гэта вентылятар і абагравальнік адначасова. Прылада не толькі падае ў дом свежае паветра, але і награвае яго праз перадачу цяпла ад таго паветра, якое выводзіцца з дома. За кошт гэтага памяшканне не ахалоджваецца і эканоміцца энергія.

Ёсць тут і адмысловая рыдлёўка для выкарчоўвання. Майстар вытворчага навучання папярэджвае: яна крыху цяжкаватая, але гэта пробны варыянт, можна зрабіць лягчэйшы. Прылада будзе карыснай для выкопвання бульбы ці перасадкі кветак. Уваткнуў пад куст і адным націскам нагі (нагінацца не трэба, бо палатно рыдлёўкі рухомае і дзейнічае па прынцыпе рычага) перакуліў зямлю.

**Распрацоўку прапаноўвалі выкупіць за сем тысяч долараў! Але ў ліцэі вырашылі яе не прадаваць.**

Адзін з наведвальнікаў гуртка, **трэцякурснік Кірыл СЦЯПУРА,** прызнаецца, што яшчэ з дзяцінства захапляецца тэхнікай. «Памятаю, як з татам трактар збіраў», — дзеліцца хлопец. На рэспубліканскім аглядзе інавацыйнай і тэхнічнай творчасці навучэнцаў і работнікаў устаноў адукацыі ён прадстаўляў пілавальную стойку-захоп «Піранья». У чым яе перавагі? Калі кладзеш кароткае бервяно на козлы і пачынаеш пілаваць яго па цэнтры, яно стараецца «скласціся» і заціскае пілу, псуе яе. «Піранья» ж моцна трымае зубцамі дрэва толькі з аднаго боку, таму такой праблемы няма. Можна нават падставіць каляску, каб палены адразу падалі туды. Пры дапамозе гэтай устаноўкі лёгка пілаваць нават крывыя бярвёны. А яшчэ прылада замацоўвае іх на зручнай вышыні так, што падчас работы рукі менш напружваюцца і спіна не баліць. На выраб «Піранні» пайшло месяцы тры: шмат часу занялі разлікі (трэба ж было зрабіць так, каб даўгое дрэва не перакульвала ўстаноўку). У выніку вынаходка заняла на конкурсе другое месца.


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.
**У холе ліцэя выстаўлены найлепшыя работы гуртка.**

— Калі мой бацька ўбачыў стойку-захоп, сказаў: «Чаму ў мяне такой дома няма?» — усміхаецца Арцём Крывапуст.

Сам ён на леташнім рэспубліканскім аглядзе прэзентаваў акучнік-палольнік «Вожык», які таксама атрымаў «серабро». Калі прылада круціцца, то за раз выконвае чатыры аперацыі: фарміруе баразну, акучвае, знішчае пустазелле і перамолвае вялікія камякі зямлі (робіць глебу «пухкай»). Акучнік можна чапляць да мотаблока. А калі зрабіць такіх тры ці чатыры, то і да трактара, і адразу апрацоўваць некалькі радоў агародніны.

Але, бадай, самы паспяховы экспанат — міні-экскаватар «Грызлі». Яго можна выкарыстоўваць на прыватным падворку, напрыклад, каб выкапаць траншэю пад электрычныя кабелі. У адрозненні ад вялікага экскаватара, ён не разбурыць клумбы і не папсуе сцежкі. Збіралі гэту машыну з таго, што знайшлі: сядзенне — з КамАЗа, колы — з сеялкі, гідрацыліндры — са спісанай сельскагаспадарчай тэхнікі. Спецыяльна набывалі толькі рухавік і размеркавальнік. Распрацоўку прапаноўвалі выкупіць за сем тысяч долараў! Але ў ліцэі вырашылі яе не прадаваць.

Дарэчы, чаму большасць вынаходак названая ў гонар жывёл? Аказваецца, для таго, каб экспанаты лепш запаміналіся. У журы на конкурсах сядзіць шмат жанчын, і «Піранья» ім западзе ў душу куды больш, чым літарная абрэвіятура СЗП (стойка-захоп пілавальная).

У калекцыі рацыяналізатараў ёсць і арт-аб'екты. Напрыклад, копія Эйфелевай вежы з пластыку. Каб выразаць дэталі для яе, прыдумалі нават спецыяльны станок. Побач стаяць сабака і певень. Гэтыя экспанаты сёлета і летась перамаглі на Рэспубліканскім конкурсе «ТэхнаЁлка» ў намінацыі «Сімвал года». А вынаходнікі ўжо думаюць над арт-аб'ектам да Года свінні — не хочацца ўпускаць пальму першынства.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*Мінск — Смілавічы — Мінск.*

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
3 05 2018 г.




# Сусвет дзяўчыны з ружовымі валасамі

**Згодна з умовамі нашага творчага конкурсу, прыём «проб пяра» ад юных і маладых нештатных аўтараў завершаны. Пакуль у рэдакцыі разглядаюцца апошнія паступіўшыя па часе работы (а па нязменнай ужо шматгадовай традыцыі некаторыя з пачаткоўцаў адправілі іх ледзьве не ў самы апошні тэрмін), «Чырвонка. Чырвоная змена» працягвае друкаваць найлепшыя матэрыялы, што былі дасланыя раней. Канчатковыя вынікі конкурсу будуць падведзены пазней, тады ж мы назавём і імёны пераможцаў. Таму сачыце за дадаткам!**

**Пакуль жа хочам павіншаваць усіх удзельнікаў нашага творчага спаборніцтва. Спадзяёмся, што і навічкі-дэбютанты, і сталыя ўдзельнікі конкурсу, якія бяруць у ім удзел на працягу апошніх двух-трох гадоў, атрымалі для сябе карысны досвед, а хто збіраецца паступаць на факультэт журналістыкі — умацаваліся ва ўласным выбары, паспытаўшы прафесійнага «хлеба» на нашай імправізаванай «кухні», пляцоўцы для самавыяўлення беларускамоўных маладых творцаў пад назвай «Я — малады. І мне не ўсё роўна!»**



**Вось як бывае: ты ходзіш у школу і нават не падазраеш, што зусім побач вучацца крэатыўныя і творчыя равеснікі. Вучаніцу адзінаццатага класа маладзечанскай СШ № 2 Анастасію Васілеўскую я заўважыла зусім нядаўна. Маю ўвагу прыцягнуў не столькі ярка-ружовы колер валасоў дзяўчыны, колькі яе цікаўны і ўпэўнены позірк.**

Здаецца, што навуку і мастацтва цяжка сумясціць. Але мая сённяшняя гераіня разбурыла гэты стэрэатып, атрымаўшы другое месца ў рэспубліканскім конкурсе дзіцячых малюнкаў «PROнавуку». У намінацыі «Касмічнае падарожжа» журы высока ацаніла Насціну работу, выкананую ў графічным стылі. А прапанавала паўдзельнічаць у конкурсе настаўніца матэматыкі, якая даведалася аб незвычайным таленце сваёй вучаніцы.

Маляваннем Насця захапляецца ўжо дзевяць гадоў. У дзяцінстве галоўнымі персанажамі ўвесь час былі лялькі. Малявала вельмі шмат і літаральна на ўсім, да чаго магла дацягнуцца, таму бацькі вырашылі аддаць дачку ў мастацкую школу.

— Маляванне дапамагае аддаць эмоцыям і пачуццям, а яшчэ гэта выдатны спосаб пераносіць уражанні на паперу, — з захапленнем расказвае дзяўчына. — А на творчасць мяне натхняюць работы фатографаў, такіх як Томас Хепкер і Гары Груер. У асноўным усе мае малюнкі выкананы ў стылі графікі і рэалізму.

Кажуць, што таленавіты чалавек таленавіты ва ўсім. Вось і Насця не выключэнне. Акрамя малявання яна захапляецца харэаграфіяй, з'яўляецца ўдзельніцай розных танцавальных конкурсаў і фестываляў. Перавагу дзяўчына аддае такім папулярным кірункам, як Hip Hop і Techno.

Таксама Насця вучыцца ў музычнай школе, іграе на двух інструментах: гітары і ўкулеле (гэта маленькая гавайская гітара). Са слоў дзяўчыны, незвычайнае гучанне апошняй з'яўляецца выдатным сродкам ад стрэсу і стомленасці, паляпшае настрой, і без гэтага атрыбута не абыходзіцца ні адна вечарынка.

Яшчэ Анастасія імкнецца перадаць свой унутраны свет, складаючы вершы і апавяданні. У дзявятым класе стала пераможцай раённага конкурсу «Слова — маладым» у намінацыі «Гэта мяне хвалюе».

— Ужо тады я цікавілася сацыялогіяй і ўзаемаадносінамі паміж людзьмі, — прыгадвае Насця. — А цяпер мяне гэта яшчэ больш хвалюе, бо я стала дарослай, і некаторыя мае погляды на жыццё змяніліся.

Адзінаццацікласніца марыць стаць архітэктарам.

— Я б хацела спраектаваць вялізныя будынкі ў стылі рацыяналізму: арт-прасторы, бібліятэкі, бізнес-цэнтры, — дзеліцца суразмоўніца.

Цяпер яна не толькі актыўна малюе, распрацоўвае чарцяжы, але і старанна рыхтуецца да выпускных іспытаў. Школьніца ўдала сумяшчае хобі і вучобу, а веды засвойвае хутка і лёгка.

### ❍ ПРА АЎТАРА

**— Я хачу стаць журналістам, — расказала пра сябе Карына, якой нядаўна споўнілася 16 гадоў. — Асноўныя крытэрыі ў выбары будучай прафесіі — цікаўнасць і камунікабельнасць. Мне падабаецца кантактаваць з людзьмі, даведвацца пра іх інтарэсы, звычкі, густы і мары. Таму ў мяне і не зусім звычайнае хобі — посткросінг (абмен паштоўкамі). Дзякуючы гэтаму захапленню я знайшла сяброў у розных кутках свету, напрыклад, у Паўночна-Афрыканскай Рэспубліцы, Балгарыі, Германіі. У мяне вялікія планы, а найбліжэйшая з іх — паступленне на факультэт журналістыкі. Для дасягнення гэтай мары я прыкладаю намаганні ўжо цяпер.**

— Адзінае, чаго мне не хапае, гэта большай свабоды для творчасці і рэалізацыі ўсіх праектаў, якія прыходзяць у галаву. Ну, і колькасці гадзін у сутках, іх занадта мала для мяне, — жартуе дзяўчына.

Мне спадабалася яе мэтанакіраванасць. Яна ўжо шмат чаго дамаглася, але пастаянна ставіць перад сабой усё новыя задачы. У найбліжэйшай будучыні Анастасія Васілеўская плануе паступіць ва ўніверсітэт, адкрыць персанальную выстаўку і перамагчы на чэмпіянаце па танцах «BIZON» у Мінску.

**Карына МІКЛУШЫС,**
**вучаніца 10 класа СШ № 2**
**г. Маладзечна.**

# Музыка — яе «цудоўнае далёка»...

**Арына Воляк — вучаніца адзінаццатага класа сталічнай гімназіі-каледжа мастацтваў імя І. Ахрэмчыка па класе харавога дырыжыравання — марыць, вядома, пра сцэну. «Я планую сваё жыццё звязаць з музыкай, — кажа дзяўчына. — Хачу паступаць на опернага вакаліста». Яе куміры — Ганна Нятрэбка і Ала Пугачова. Апроч таго, Арына ведае некалькі моў, шмат падарожнічае і захапляецца фатаграфіяй.**



Каледж дзяўчына лічыць не проста ўстановай адукацыі, а сям'ёй, дзе кожны настаўнік мае свой адменны падыход да вучняў і з'яўляецца для іх не толькі педагогам, але і сябрам. У такім месцы немагчыма не прасякнуцца любоўю да музыкі.

— У нас часта праходзяць «капуснікі», для якіх мы рыхтуем выступленні, — расказвае Арына. — Апошні, у якім брала ўдзел, быў прысвечаны Дню ўсіх закаханых. Я і мае аднакласнікі ўзялі інструменты і прыдумалі сцэнкі, музычныя нумары. Падчас такога вечара можа нават атрымацца якая-небудзь новая песня. Мы адна сям'я.

Любоў да музыкі ў Арыны прачнулася рана. «Мама расказвала, што першым маім гукам была нейкая нота, але я вельмі сумняваюся, што гэта праўда», — кажа дзяўчына. На яе вельмі паўплываў дзядуля, які вадзіў унучку па вёсцы, заводзіў у хаты да суседзяў і прасіў выканаць песню ці расказаць верш. За гэта юная артыстка атрымлівала цукеркі. У тры-чатыры гады ведала амаль усе песні, якія спявалі дарослыя.

— Як трапіла ў оперны тэатр? Гэта вельмі цікавая гісторыя. Была на вяселлі свайго брата, а дзяўчына, з якой ён жаніўся, хадзіла ў дзіцячую студыю пры тэатры, вучылася там на вакалістку. Я спявала на гэтым вяселлі, а ўжо на наступны дзень мы з мамай паехалі на праслухоўванне ў тэатр. Нам раілі пачакаць год, аднак і я, і мама ўсведамлялі, што не зможам чакаць. І мяне праслухалі. Потым не толькі спявала разам з іншымі дзецьмі, але і выконвала сольныя нумары ў некаторых операх: партыю пастушка ў оперы Джакама Пучыні «Тоска» і невялікую арыю ў «Макбеце» Вердзі. Некалькі разоў сыходзіла са студыі з-за вялікай нагрузкі ў каледжы, але ў выніку вярнулася і не шкадую, — расказвае суразмоўніца.

Але тэатр оперы і балета — не адзінае месца, дзе выступае юная артыстка. Ужо ў 11 гадоў Арына выконвала невялікую ролю дзяўчынкі са сну ў пастаноўцы «Вестсайдская гісторыя» ў Беларускім музычным тэатры. У чэрвені 2016 года Арына брала ўдзел у канцэрце, які трансляваўся па тэлебачанні. Там было шмат беларускіх артыстаў: Алена Ланская, Аляксандр Ціхановіч, Ядвіга Паплаўская, Ксенія Сітнік і іншыя.

— У каледжы я спявала сола. Паглядзець на наш хор прыйшла дырыжор з кафедры харавога дырыжыравання Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі і сказала, што ёй патрэбна дзяўчынка для ўдзелу ў канцэрце. Наша хормайстар патэлефанавала мне: трэба тэрмінова спяваць. Папрасілі выканаць «Прыгожае далёка»... Пазней мне падабралі партнёра, хлопчыка з музычнай школы, з якім я і зараз падтрымліваю стасункі. Таксама ўдзельнічала ў зборным хоры, а гэта некалькі сотняў дзяцей з усёй краіны. Было вельмі цікава папрацаваць з Інэсай Бадзякай, кіраўніком кафедры харавога дырыжыравання. Яна чалавек з характарам, спачатку нават страшна было. Работа на тэлебачанні была надзвычай складаная: табе ўвесь час кажуць глядзець у адну кропку, нельга паказваць лішнія эмоцыі. Было страшна і нязвыкла, але гэта велізарны досвед для мяне.

Бацькі ніколі не спрабавалі адгаварыць Арыну ад любімага занятку, разумеючы, як складана ёй будзе без музыкі. «Калі людзі лічаць, што музыка — пустое марнаванне часу, ім проста не трэба займацца гэтым. Многія бацькі спрабуюць адгаварыць дзяцей ад творчых прафесій, бо жадаюць усяго самага лепшага для іх. Проста трэба знайсці «кропкі судакранання». Ты павінен займацца тым, што табе сапраўды падабаецца».

Вакальнае мастацтва трывала «засела» ў душы дзяўчыны і не збіраецца яе пакідаць.

**Анастасія СУРЫНАВА,**
**вучаніца 10 «А» класа**
**гімназіі № 8 г. Мінска.**

### ❍ ПРА АЎТАРА

**Анастасія вельмі любіць класічны і музычны тэатр, сама займаецца ўжо дзявяты год у тэатральнай студыі.**

**— Магчыма, таму я абрала гераіняй матэрыялу маю сяброўку і калегу Арыну, — расказала 15-гадовая аўтарка. — У мяне было шмат варыянтаў будучай прафесіі: рэжысёр музычнага тэатра, урач, гід. Але зараз я скіраваная паступаць на журфак і спадзяюся, што гэта маё. У вольны час люблю гуляць з сябрамі, вывучаць новыя месцы ў родным горадзе, чытаць або глядзець фільмы. Мой упадабаны жанр — мюзіклы, асабліва брадвейская класіка.**

# ВЯЛІКАЕ МАЛЕНЬКАЕ ШЧАСЦЕ

**Мая сям'я — гэта бацька, матуля, брацік і сястрычка. На сённяшні дзень яны самае дарагое, што ёсць у мяне. Быць з імі разам — шчасце. Не, наша жыццё не ціхае, не напоўненае толькі спакоем. Наадварот, мы жывём у турботах, у нейкіх праблемах. Ці не кожны дзень трапляем, як нам падаецца, у безвыхадныя сітуацыі.**

...Вось і зараз я іду ў аптэку купіць лекі маленькай Марыльцы: зноў застудзілася. Ужо звечарэла, і неба ўсыпана бліскучымі зоркамі. НасупераК маўму невясёламу настрою яны прывабна міргаюць, ярка зззяючы ў вышыні. «Гэта сапраўдная карціна міру ў маёй краіне», — такая думка прамільгнула раптам у галаве. І я падумала: няхай будуць турботы, маленькія няўдачы, няхай не спраўджваюцца пакуль што нашы мары. Страшна ўявіць іншае: каб над краінай не навісла пагроза вайны. Тады ўсе клопаты, маленькія і вялікія, адразу страцілі б сэнс....

Зараз я іду ў аптэку, куплю лекі і мая сястрычка выздаравее. Я вучуся ў гімназіі, мару стаць журналістам. У мяне добрыя сябры, яны падтрымліваюць мяне, і я гатова дапамагчы ім. Часам мы добра адпачываем, забаўляемся, займаемся спортам. Але ўсяго гэтага магло б і не быць. Вайна не дазволіла многім нашым равеснікам спраўдзіць многія мары...

Трагічную гісторыю з той жудаснай вайны нясе і наша сям'я. Напамін пра гэта — помнік ахвярам, што стаіць недалёка ад Пінска. У спісе прозвішчы рабочых чыгункі, іх расстралялі гітлераўцы за знішчаны фашысцкі эшалон. Сярод загінулых — чатырнаццацігадовы хлопчык. Па волі лёсу ў той дзень ён пайшоў з дарослымі працаваць на чыгунку, падмяніўшы старэйшую сястру. Вайна не пашкадавала прыгожага, статнага, ні ў чым не павіннага падлетка, абарвала жыццё, забрала яго будучыню, яго шчасце.

Бо самае дарагое ў чалавека — жыццё. Пакуль мы маленькія — шчаслівыя ад матулінай ласкі, ад яе шчырай любові, ад бацькавых клопатаў за нас. Падрастаем і становімся шчаслівымі, здаецца, ад новай моднай вопраткі ці дарагога мабільнага тэлефона. Стаўшы дарослымі, адчуваем шчаслівы настрой у каханні. Шчасце і ў тым, каб здзейсніць сваю мару — набыць жаданую прафесію...

**❍ ПРА АЎТАРА**

**Анастасіі — 17 гадоў. Пра сябе яна кажа:**

**— Я звычайная дзяўчынка. Сваю знешнасць мару выкарыстаць для будучай прафесіі. Бачу сябе ў будучым або ў якасці дыктара, або вядучай маладзёжнай праграмы. Люблю вывучаць нашу родную мову — двойчы ўдзельнічала ў школьных навуковых канферэнцыях. Я добры дэкламатар. Дарэчы, калісьці атрымала гран-пры ў конкурсе выразнага чытання вершаў і сцэнічнага вобраза. Менавіта таму маю ў школе абавязак — штогод весці святочныя лінейкі. А мой любімы прадмет — гісторыя Беларусі.**

Зацішша — зусім не ваенная назва вуліцы ў Мінску. На ёй пасярод тратуара расце даволі старая ўжо бяроза. Яе гісторыя ідзе з ваенных дзён. Жанчына, якую можна было ўбачыць раней каля яе, ужо не прыходзіць. Але дрэва па-ранейшаму сведка таго часу. Бярозку пасадзіў сын той жанчыны, герой, які не вярнуўся з вайны. Маці абараніла дрэва, пачуўшы рокат бульдозера. А чалавек зразумееў яе. Цяпер каля бярозы сваволяць дзеці, знаходзяць прытулак закаханыя, іншыя здзіўляюцца людскому ўчынку пакінуць дрэва жыць пасярод тратуара.

Па волі выпадку і назва вуліцы Зацішша як быццам бы нагадвае пра хвіліну маўчання па загінулых. Гучаць адгалоскам той жудаснай вайны і некаторыя іншыя назвы вуліц нашага горада.

Яны носяць імёны герояў: Заслонава, Панфілава, Рафіева, Кульман, Мірашнічэнкі. Нельга перакрэсліць гісторыю. Уявіць яе чыстай белай старонкай — гэта значыць здрадзіць светлай памяці. Не бачыць на гэтым белым аркушы прозвішчы герояў-пераможцаў і забыць падзеі жудаснага часу — значыць, не ведаць і не разумець каштоўнасць мірнага жыцця.

...Я ўжо дома і назіраю, як сваволіць паздаравеўшая Марылька, разглядаю спартыўныя ўзнагароды свайго брата, разважаю пра сябе, пра сваю мару. А хутка матуля пазаве нас на смачна прыгатаваную вячэру. І цяпер ужо разумееш, як добра ўсё ў нас. Напэўна, гэта і падказвалі мне мірна зіхацеўшыя на небе зоркі...

**Анастасія ЯРАХНОВІЧ,**
**вучаніца 11 класа гімназіі № 12 г. Мінска.**

# ЭМОЦЫІ — ПАСЛЯ РЫНГА

**Раней бокс быў выключна мужчынскім відам спорту. Яшчэ ў XIX стагоддзі брытанская феміністка, жанчына-пэр, баранеса Эдыт Самерскіл выступала за забарону бокса з-за яго жорсткасці. Што ж казаць пра жаночыя баі?**


Віталіна ВІРЫНСКАЯ.

Многія лічаць, што прадстаўніцы прыгожага полу — істоты слабыя, якія не могуць дэманстраваць сваю сілу нароўні з мужчынамі. Я прытрымлівалася такога ж меркавання, пакуль не пазнаёмілася з юнымі маладзечанскімі спартсменкамі.

Вікторыя Мандрык займаецца тайскім боксам два гады. «На старце» яе мама была супраць такога хобі. «Махаць кулакамі — гэта не для дзяўчат», — паўтарала яна. Але бачачы непадробную цікавасць дачкі, дазволіла ёй схадзіць на трэніроўку.

— Я прыйшла ў спартыўны клуб «Гладыятар» і ўбачыла дзяўчыну, якая з азартам і бляскам у вачах калаціла баксёрскую грушу, — успамінае Віка.

Гэта была Віталіна Вірынская, бронзавы прызёр чэмпіянату свету па тайскім боксе, сяміразовая чэмпіёнка Беларусі па ўшу.

— Многія дзяўчаты прыходзяць толькі для таго, каб зрабіць забаўнае сэлфі, — заўважыла Віталіна.

Таму сама аддае перавагу трэніроўкам з юнакамі, у іх сапраўды можна набрацца досведу, яны могуць дапамагчы парадай, паказаць, як трэба рабіць тое ці іншае практыкаванне.

Трэніруецца два-тры разы ў тыдзень па дзве гадзіны. Парным спарынгам папярэднічае размінка з гантэлямі, скакалкай. А ў самым канцы баксёры звычайна качаюць прэс, ногі, шыю.

— Спецыяльнай дыеты я не прытрымліваюся, бо заўсёды знаходжуся ў патрэбнай вазе. Адзінае правіла — ніякага курэння і спіртных напояў, — сцвярджае суразмоўніца.

Спорт, вядома ж, загартоўвае характар, але прырода бярэ сваё. На рынгу Віталіна моцная, упэўненая, актыўная, а ў звычайным жыцці можа быць добрай, далікатнай і нават сентыментальнай.

— Мяне можа расчуліць сумны фільм, кранальная гісторыя, — прызнаецца дзяўчына. — На рынгу я ніколі не плакала, нават калі былі траўмы. А пасля бою, калі ніхто не бачыць, магу даць волю пачуццям.

У стылі адзення спартсменка не губляе жаноцкасці: робіць макіяж, манікюр, любіць насіць сукенкі і абутак на высокіх абцасах. Як і любая дзяўчына, марыць пра вялікую сям'ю.

Зразумела, што бокс робіць людзей мацнейшымі, але не пазбаўляе пры гэтым дзяўчат прыгажосці, далікатнасці і чуласці.

**❍ ПРА АЎТАРА**

**Аліне 16 гадоў. Пра сябе яна кажа, што ў яе было шмат розных захапленняў: танцы, музыка, акцёрскае майстэрства. Але потым дзяўчына аддала перавагу журналістыцы і ў будучым хоча звязаць з ёй сваё жыццё.**

